PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 27 (2460) Год XLVIII | Беласток, 6 ліпеня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Адыход аўтарытэту

Аляксандр Максімюк

25 чэрвеня беларусы развіталіся з Васілём Быкавым. Праводзіць пісьменніка ў апошнюю дарогу прыйшло пад Дом літаратара ў Мінску больш за 20 тысяч чалавек. Наступны дзесятак тысяч далучыўся да пахавальнага шэсця на праспекце Скарыны. Дзяржаўная дэлегацыя з міністрам культуры Леанідам Гулякам пакінула паховіны, калі сын пісьменніка ахінуў труну бел-чырвона-белым сцягам — сімвалам незалежнай Беларусі, якога ў 1995 годзе забараніў Аляксандр Лукашэнка пасля свайго прыходу да ўлады.

Станіслаў Шушкевіч — першы кіраўнік адроджанай Беларусі, сказаў пра цяперашняга прэзідэнта А. Лукашэнку, што толькі ігнарант мог асуджаць такога як В. Быкаў чалавека. Ды дадаў, што А. Лукашэнка пасаромеўся паказацца на паховінах чалавека, якога сталі называць сумленнем народу. Беларускія ўлады пакрыўдзіліся, калі расійскія газеты назвалі Быкава „дысідэнтам" і „выгнаннікам" ды рашуча заявілі, што ў пісьменніка быў свабодны выбар месца для працы і жыцця, што родная Беларусь заўжды яго прызнавала.

Усё ж апошнія пяць гадоў жыцця В. Быкаў правёў па-за межамі роднай Беларусі — у Фінляндыі, Нямеччыне і Чэхіі, — шукаючы, як сам сцвярджаў, месца, у якім можна свабодна дыхаць і працаваць. У мінулым годзе прэзідэнцкі дарадчык Эдуард Скобелеў загадаў дзяржаўным часопісам не друкаваць Быкава ды іншых пісьменнікаў, якія не падтрымліваюць палітычную лінію А. Лукашэнкі. Вось такая свабода і такое прызнанне роднай Беларусі.

Нашу Беласточчыну В. Быкаў наведаў 26 чэрвеня 1992 года з беларускай дзяржаўнай дэлегацыяй. Быў гэта першы раз, калі з намі — беларускай нацыянальнай меншасцю ў Польшчы — сустрэўся кіраўнік беларускай дзяржавы. Праходзіла сустрэча ў Ваяводскай управе. Побач старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі С. Шушкевіча і міністра замежных спраў Пятра Краўчанкі слова ўзяў тады і Васіль Быкаў ды сказаў нам, што лёс кожнай меншасці няпросты ды ўся мудрасць у тым, каб шукаць такога варыянту, які захоўвае інтарэсы дзяржавы і інтарэсы меншасці.

Пад канец 1999 года супольна з Беларускім саюзам, Цэнтрам грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь і Кафедрай беларускай культуры ў Беласто-

[працяг ☞ 2]

Фота PAP/CAF

Абаронца нашай супольнасці

Міра Лукша, Мацей Халадоўскі

Сучасным Францішкам Скарынам назваў прэзідэнт Аляксандр Кваснеўскі Сакрата Яновіча ў час урачыстасці ўручэння празаіку, паэту, эсэісту і выдаўцу з Крынак узнагароды імя Анджэя Дравіча.

Свята адбылося 17 чэрвеня ў варшаўскіх агародах Прэзідэнцкага палаца з удзелам Аляксандра Кваснеўскага, ягонай жонкі, прадстаўнікоў урада, свету культуры і дыпламатычнага корпуса. Удзельнічала ў ёй жонка знаўцы рускай літаратуры, перакладчыка, публіцыста, старшыні Камітэта радыё і тэлебачання, пакойнага ад шасці гадоў Анджэя Дравіча — Вера.

Узнагарода ўручалася ўжо чацвёрты раз. Прысуджаецца яна капітулам Фонду „Semper Polonia" за заслугі для папулярызацыі польскай культурнай спадчыны (таксама ў разуменні шматкультурнасці) у свеце, талерантнасць і старанні для ўзаемнага зразумення. Папярэдне атрымалі яе м.інш. прысутныя на чэрвеньскай урачыстасці перакладчык польскай літаратуры на рускую мову Святаслаў Свяцкі і брытанскі гісторык Норман Дэйвіс. Першая ўзнагарода была ўручана 5 чэрвеня 2000 г., а яе лаўрэатам стаў галандскі журналіст і публіцыст Міло Амштадт. Сёлета запрапанаваны былі 37 кандыдатаў (на 110 да гэтай пары). Назначаюць іх члены капітула і паслы польскіх дыпламатычных прадстаўніцтваў у свеце. Як сказаў міністр Канцылярыі прэзідэнта Марэк Унгер, член капітула, у тайным галасаванні вырашана было ўшанаваць якраз Сакрата Яновіча галоўным чынам „za ukazywanie barw wielokulturowości w Polsce i przybliżanie wartości Polski Obojga Narodów". Прафесар Караль Мадзалеўскі адчытаў лаўдацыю падрыхтаваную непрысутным па прычыне хваробы Яцкам Куранем, адным з вядучых дзеячаў апазіцыі ў часах ПНР, былым старшынёй сеймавай камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей, сябрам Сакрата Яновіча. Прывёў ён матывы, якія кранаў у сваёй творчасці лаўрэат:

— Вялікае княства Літоўскае было тым, аб чым думаем, успамінаючы аб шматкультурнай Еўропе.

І далей:

— Беларуская кроў лілася багата. Самі беларусы нічые крыві не пралілі. Можа таму тоеснасць беларусаў такая кволая.

Непасрэдна аб лаўрэаце Яцак Курань сказаў:

— Сакрат Яновіч паказвае польскім беларусам дарогу для захавання ўласнае тоеснасці. Трэба ўспамагаць беларусаў у працы для падтрымкі культуры пагранічча.

Узнагароду (статуэтку) уручыў пісьменніку з Крынак прэзідэнт Кваснеўскі. Атрымаў ён яшчэ чэк на значную суму і графікі, якія перадаў Фонду „Semper Polonia" на ўфундаванне стыпендый паланійнай моладзі. Аляксандр Кваснеўскі падкрэсліў:

— Спадар Сакрат Яновіч — значная індывідуальнасць нашага жыцця. To rzecznik całej naszej zbiorowości.

Пасля зазначыў:

— Мы замала задумваемся над драмай беларускага народа. Польшча па-

[працяг ☞ 2]

Узнагароды найлепшым ☞ 3

Улады Саюза Амт-Гатштэт рашыліся ўзнагародзіць трое вучняў з Гайнаўскага павета, якія вылучыліся працай у карысць іншых людзей. Сталі імі белліцэісты. Наталля Зофія Лемеш узнагароджана была за культурна-грамадскую працу ў карысць беларускай нацыянальнай меншасці. Заўважаны былі яе дасягненні ў арганізацыі і вядзенні беларускіх мерапрыемстваў і супрацоўніцтва з тыднёвікам „Ніва".

Шмат нас ☞ 4

Мінулагодні перапіс паказаў толькі замацаванне існуючага падзелу праваслаўных на беларусаў і палякаў. Зразумела, што адзіным фактарам, які стрымоўваў і ў будучыні можа запавольваць працэс паланізацыі ёсць беларуская культура і актыўнасць яе стваральнікаў. На якую-небудзь дапамогу, хаця б маральную, з боку лукашэнкаўскай Беларусі нельга спадзявацца.

Недавер да Еўрасаюза ☞ 4

У Чыжоўскай гміне толькі 31,77% выбаршчыкаў прыняло ўдзел у рэферэндуме па далучэнні Польшчы да Еўрасаюза. Многія гаспадары і пенсіянеры не вераць, што іх голас можа мець уплыў на ход падзей. Большая яўка была сярод маладых.

Адкрываў на свет вочы ☞ 8

Збігнеў Папельскі быў асабіста знаёмы з Янам Тарасевічам. Пазнаёміліся яны ў час вучобы ў музычнай школе сясцёр Франкевіч. Часта, разам з Ежы Максымюком наведваў кампазітара дома. Першыя творы Збігнева Папельскага напісаны менавіта ў стылі Тарасевіча.

Ажурная вёска ☞ 9

У 1915 годзе праваслаўныя жыхары Зачарлян, у якіх пражывала ў той час адно дзве каталіцкія сям'і, былі прымушаны эвакуіравацца ў Расію. Вяртанне з бежанства ў пустую вёску было ўцёкамі з агню ў полымя. Галеча вярнуўшыхся праваслаўных, у параўнанні з не так жорстка дасведчанымі ваенным лёсам суседзямі, выклікала горыч і бунт.

Што будзе з ваўкамі ☞ 11

На ваўкоў наракалі паляўнічыя з гуртка „Цецярук" у Кляшчэлях. Водзяцца яны там у старым лесе каля Елянкі і каля Дабрывады. Не было там чуваць пра шкоды хатняй жывёле, але шкоды здараліся ў суседняй Арлянскай гміне ў Паўлінаве, Вульцы-Выгаеўскай і Рыгораўцах.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Абаронца нашай супольнасці

[1 ☞ працяг]
вінна адчуваць адказнасць за лёсы Беларусі. Я выказваю польскім беларусам падзяку за будаванне дэмакратычнага грамадства і пазіцыі Польшчы ў свеце. Разлічваю на тое, што Сакрат Яновіч паможа нам шмат навучыцца з беларускасці, якая так многа супольнага мае з польскасцю.

Сакрат Яновіч не скрываў хвалявання:

— Вось стаіць перад вамі чалавек шчаслівы.

Лаўрэат пералічыў імёны з-па-за беларускага асяроддзя, якія напаткаў на дарозе свайго жыцця і якія мелі на яго вялікі ўплыў. Сярод іх — Яцка Кураня, ад якога „чэрпае ўмеласць палітычнага думання аб будучыні", пісьменніка Віктара Варашыльскага, які прабудзіў у ім дух непадатлівасці, Адама Міхніка, што выклікаў у ім канструктыўны шок, пісьменніка Тадэвуша Канвіцкага, які захапіў яго адлюстраваннем Дабрарусі ды публіцыста Ежы Туровіча, стваральніка парыжскай „Культуры" Ежы Гедройца і прафесара Браніслава Герэмка.

— Беларусы — родныя браты палякаў, — гаварыў лаўрэат. — Беларускае адраджэнне не было б магчыма без ангажавання палякаў. Паланафільства было ў Беларусі чымсьці ўсёабдымным. Сёння польскія беларусы, працуючыя дзеля ўласнай культуры, узбагачаюць польскую культуру. Польская беларуская літаратура добра *задамавілася* ў еўрапейскай культуры.

Лаўрэат Яновіч уручыў прэзідэнту некалькі выданняў, сярод іх — экземпляр гадавіка „Annus Albaruthenicus", які выдаецца заснаванай ім асацыяцыяй Villa Sokrates, выданні сваіх кніг, фотаальбом прысвечаны Беларускаму літаратурнаму аб'яднанню „Белавежа".

Урачыстасць, якая працягвалася больш за гадзіну, перапляталася выступленнямі студэнтаў і выпускнікоў Музычнай акадэміі імя Ф. Шапэна ў Варшаве. Перадавала яе ў прамым эфіры Першая праграма Польскага тэлебачання, да таго ў найлепшым часе — пасля 18 гадзіны.

— Гэтая ўзнагарода была для мяне пэўнай нечаканасцю, — успамінае Сакрат Яновіч момант, калі даведаўся пра тое, што ён да яе кандыдат. — Першы паведаміў мяне Тамаш Саевіч. Пасля сталі дапытвацца журналісты. Я тлумачыў гэта тым, што шмат асобаў з капітула ўзнагароды ведалі мае кніжкі, чыталі нешта маё — гэта м.інш. дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Міхал Ягела, гэта Яцак Курань, жонка Дравіча спадарыня Вера, Караль Мадзалеўскі... Адчуў, што пераважылі гэтакія аргументы — тая літаратурная творчасць і тое, што я раблю ў часопісе на мовах Еўропы „Annus Albaruthenicus". І другі момант — калі я знаходзіўся ў салідарніцкім падполлі, выдаваў часопіс „Беларускія дакументы" і іншыя. Пару гадоў таму атрымаў я дыплом заслугі ад тадышняга міністра замежных спраў Браніслава Герэмка — за папулярызацыю польскай культуры за мяжой. Бо беларуская культура, якую ствараем тут — гэта і польская культура.

Сакрат Яновіч, найбольш вядомы чалавек у Крынках — загаварылі да яго, пасля агучанага ўручэння ўзнагароды, людзі ў мястэчку па-беларуску. Звазіў яго ў сталіцу з гонарам сам войт Крыноцкае гміны Багуслаў Мар'ян Панасюк, ушанаваўшы змардаванае здароўе *nieustępliwego duchem* рупліўца роднае культуры.

Міра Лукша, Мацей Халадоўскі

Грашова-палітычны цырк

Сітуацыя вакол беларуска-расійскай інтэграцыі ўсё больш нагадвае трагікамедыю. Асабліва гэта тычыцца аб'яднання грашовых сістэм.

Аб тым, што пераход на расійскі рубель вось-вось адбудзецца ў Беларусі гавораць з 1993 года. Час ад часу нават шмат хто з народу пачынаў верыць у гэтыя прагнозы. Але час ішоў, а нічога падобнага не адбывалася. Разам з тым і беларускі рубель не станавіўся больш-менш сур'ёзнай валютай, так і застаючыся фармальна толькі разліковым білетам Нацыянальнага банка РБ. Гэта зразумела, бо ні эканоміка, ні фінансавая палітыка дзяржавы не садзейнічалі ўмацаванню беларускіх „зайцоў", пераўтварэнню іх у канвертавальную валюту.

У такіх варунках, відаць, была нейкая логіка, калі ўлады, хоць і на словах, імкнуліся да цалкавітай валютнай інтэграцыі з больш стабільным і больш моцным расійскім рублём. Праўда, пастаянна гэтаму аб'яднанню нешта перашкаджала.

Апошнюю „перашкоду" варта разгледзець падрабязней.

У пачатку чэрвеня ў Мінск завіталі даволі важныя расійскія госці — віцэ-прэм'ер, міністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын і старшыня Цэнтральнага банка Сяргей Ігнацьеў. Мэта візіту такіх „фінансавых" асоб відавочная — вырашыць, нарэшце, праблему аб'яднання грашовых сістэм абедзвюх краін. А калі больш канкрэтна — вырашыць пытанне аб пераходзе Беларусі на расійскі рубель. Аб гэтым ужо гаварылася многа і тым больш, што гэтага, нібыта, прагнуць усе беларусы. Вынікі візіту і сустрэч з прадстаўнікамі беларускага Нацыянальнага банка і прэзідэнтам А. Лукашэнкам, пададзеныя расійскай і беларускай прэсай, гаварылі аб „канчатковым" вырашэнні ўсіх праблем, асноўная з якіх — праблема эмісіі хоць і расійскіх, але „без пяці хвілін" саюзных грошай. Беларускі бок на працягу ўсяго перыяду грашовай інтэграцыі настойваў на роўныя правы ў магчымасці вырашаць колькі банкнот таго ці іншага наміналу варта друкаваць. Пры гэтым тое, што эканоміка Беларусі гэта толькі 1/25 частка расійскай пад увагу не бралася. Расіян такі падыход, вядома, не задавальняў. І вось пасля 7 чэрвеня (дня візіту расійскіх прадстаўнікоў) беларускі бок вуснамі намесніка старшыні Нацыянальнага банка Паўла Калаўра, загаварыў аб тым, што „мы ніколі не прэтэндавалі на права эмісіі наяўных расійскіх грошай, прызнаючы за Банкам Расіі ягонае выключнае права на выкананне гэтых функцый". У абмен на згоду, расійскі бок пагаджаўся ўвесці двух прадстаўнікоў Нацбанка Беларусі ў склад рады дырэктараў Цэнтральнага банка Расіі.

Нават 17 чэрвеня аб хуткім зближэнні пазіцый галоўных банкаў абедзвюх краін у Санкт-Пецярбургу гаварылі кіраўнікі ўрадаў Расіі і Беларусі — Міхаіл Касьянаў і Генадзь Навіцкі. А ўжо назаўтра „грукатнуў гром". Аляксандр Лукашэнка заявіў, што рашэнне аб эмісіі мае прымаць толькі адмыслова створаная з роўнай колькасці расіян і беларусаў Міжбанкаўская рада. Далей ішлі сенсацыя за сенсацыяй. Аказваецца перайсці на агульную валюту можна будзе толькі тады, калі будуць выконвацца ўсе ранейшыя эканамічныя пагадненні паміж дзяржавамі, ды і ўвогуле ўвядзенне адзінай валюты для беларускіх улад — не самамэта. Да таго ж пытанне настолькі сур'ёзнае, што варта даведацца, што думае на гэты конт беларуская апазіцыя, дзе, па словах А. Лукашэнкі, „есть два-три толковых человека".

Канешне ж, добра, што галава дзяржавы прызнаў у прадстаўнікоў апазіцыі наяўнасць розуму і гэтым самым зрабіў ім неблагую рэкламу. Праўда, усім вядома, што сярод апазіцыі, што прагне незалежнасці Беларусі і дэмакратыі, няма ніводнага чалавека, які б вітаў страту нават маленечкай часткі суверэнітэту сваёй дзяржавы, не гаворачы ўжо аб перспектыве знікнення яе грошай. Горш тое, што беларускі прэзідэнт вельмі лёгка мяняе накірункі палітыкі краіны, што выстаўляе Беларусь папросту несур'ёзным эканамічным партнёрам, у даным выпадку з Расіяй. А яшчэ больш прыкра, што беларускім грамадзянам не застаецца нічога іншага як прыносіць свой дабрабыт, аўтарытэт уласнай краіны ды і яе незалежнасць на алтар нечай палітычнай гульні, сэнс якой надзвычай трывіяльны — хто мае грошы, той мае ўладу.

Уладзімір Лапцэвіч

„Польфарма" перадала Беларусі вялікую партыю лякарстваў

Вялікую партыю лякарстваў перадало хворым дзецям цераз Беларускі дзіцячы фонд самае буйное фармацэўтычнае прадпрыемства Польшчы „Польфарма".

Сімвалічная перадача гуманітарнай дапамогі на агульную суму больш за 15 тысяч долараў адбылася ў Мінскім гарадскім цэнтры медыцынскай рэабілітацыі дзяцей з псіханеўралагічнымі захворваннямі. У красавіку такая дапамога была накіравана ў Рэспубліканскі клінічны шпіталь інвалідаў вайны і Інстытут анкалогіі і медыцынскай радыялогіі.

Антыбіётыкі, сардэчна-сасудзістыя і неўралагічныя прэпараты будуць выкарыстаны ў лячэбным працэсе. Штодзень у Цэнтры медыцынскай рэабілітацыі шматлікія працэдуры праходзяць 140 чалавек. Высокакваліфікаваныя лекары, спецыялісты, выкарыстоўваючы унікальныя методыкі, літаральна вяртаюць маленькіх інвалідаў у паўнацэннае жыццё. Восемдзесят працэнтаў пацыентаў, якія пападаюць сюды на лячэнне, атрымоўваюць дапамогу па інваліднасці. Пасля рэабілітацыі ў цэнтры такіх застаецца толькі дваццаць адсоткаў.

www.naviny.by

Адыход...

[1 ☞ працяг]
ку выдаў я кнігу прозы пісьменніка „Сцяна". З таго часу не пакідала мяне думка, што В. Быкаў здолее прыехаць да нас яшчэ раз — так звычайна, як прыязджае пісьменнік у краіну, у якой выдалі ягоны пераклад. Гэтак не сталася...

Васіль Быкаў сёння належыць усяму беларускаму народу, а народ, каго захоча, таго і здолее ў ім убачыць: пісьменніка, грамадскага дзеяча, палітыка, маральны аўтарытэт...

Аляксандр Максімюк

Візіт журналістаў

Па запрашэнні Бюро еўрапейскай інтэграцыі Падляшскай ваяводскай управы, у рамках супрацоўніцтва з консульствам РП у Гродне, Падляшша наведалі тры беларускія журналісткі з Беларускай асацыяцыі журналістаў. Былі яны запрапанаваны БАЖ з немалой групы і адабраны якраз яны, каб прадставіць пасля ў сваіх газетах — „Głos znad Niemna", „Вечерний Гродно" і „Беларуская газета" ў Мінску — між іншым накірункі і формы трансгранічнага супрацоўніцтва, падрыхтоўку падляшскага рэгіёна да ўваходу краіны ў Еўрасаюз (шанцы і пагрозы), выкарыстанне ў рэгіёне сродкаў з еўрапейскіх фондаў, структуру і прынцыпы функцыянавання сацыяльнай апекі ў нашым рэгіёне. Пабывалі яны, апроч Беластока — у Аўгуставе, дзе пазнаёміліся са структурай і функцыянаваннем тэрытарыяльнага самаўрада, актуальным станам і перспектывамі развою горада, наведалі Гарадскі цэнтр сацыяльнай дапамогі (лаўрэат узнагароды прэм'ера РП), знаёміліся з майстэрнямі заняткавай тэрапіі, а таксама наведалі Аўгустаўскі канал (цікавіліся выкарыстаннем еўрапейскіх сродкаў і актуальнымі інвестыцыямі на канале). У Белавежы пазнаёміліся з аховай вялікіх лясных абшараў на прыкладзе Белавежскай пушчы, у Кузніцы — з праблемамі пагранпераходаў і мытнай абслугі. У Беластоку сустрэліся з прадстаўнікамі Падляшскага фонду рэгіянальнага развою — сустрэча была арганізавана Аддзелам скарбу і маёмасных пераўтварэнняў. Пабывалі таксама ў Цэнтры грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь, дзе пазнаёміліся з праграмай і метадамі дзейнасці гэтай арганізацыі.

Не прыбыў, на жаль, на студыйны візіт запрошаны прадстаўнік гродзенскай абласной адміністрацыі.

(куша)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Упаўнаважаны Управы Амт-Гатштэт па справах супрацоўніцтва з Гайнаўскім паветам Эгон Швільгін (злева) уручыў дырэктару Яўгену Сачко сцяг Еўрасаюза

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Зося Лемеш атрымала ўзнагароду з рук упаўнаважанага Управы Амт-Гатштэт па справах супрацоўніцтва з Гайнаўскім паветам Эгона Швільгіна

Узнагароды найлепшым

У час заканчэння навучальнага года ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, якое адбылося 20 чэрвеня, прысутнічалі дэлегацыя з Нямеччыны і гайнаўскія павятовыя ўлады з намеснікам старасты Ежым Сіракам і кіраўніком Аддзялення прамоцыі рэгіёна Валянцінай Горбач. Белліцэй наведалі прадстаўнікі Управы Саюза гмін Амт-Гатштэт, які супрацоўнічае з Павятовым старастам у Гайнаўцы.

Мерапрыемства адкрыў дырэктар Яўген Сачко, які ў выступленні адклікаўся да ідэй інтэграцыі з Еўрасаюзам. Сёлетні навучальны год прынёс новыя еўрапейскія перспектывы, якія патрабуюць добра вучыцца і працаваць для супольнага еўрапейскага дабра і супольнай будучыні.

— Мы, беларусы, уносім у Еўрасаюз патрыятызм, нашую культуру і пашану для зямлі. Будзем намагацца захаваць у Еўропе нацыянальную тоеснасць, — заявіў дырэктар Яўген Сачко. Выпускнікам белгімназіі прапанаваў застацца на трохгадовую вучобу ў белліцэі.

Сабраных белліцэістаў сардэчна віталі ўпаўнаважаны Управы Амт-Гатштэт па справах супрацоўніцтва з Гайнаўскім паветам Эгон Швільгін і бурмістр Гатштэта Карэн Гансен. Эгон Швільгін выказаў сваю радасць ад станоўчых рэзультатаў праведзенага ў Польшчы еўрасаюзнага рэферэндуму і ўручыў дырэктару Яўгену Сачко сцяг Еўрасаюза. Сказаў ён, што жыхароў Польшчы чакае многа новых задач. Паінфармаваў, што ў саюзе шасці гмін Амт-Гатштэт жыве дацкая меншасць (пры мяжы з Даніяй) і ўлады саюза рашаюць праблемы гэтай нацыянальнай меншасці. Улады Саюза Амт-Гатштэт рашыліся ўзнагародзіць трое вучняў з Гайнаўскага павета, якія вылучыліся працай у карысць іншых людзей. Сталі імі белліцэісты Наталля Зофія Лемеш, Агнешка Пуц і Юстына Грыцюк. Усе яны вылучаюцца поспехамі ў вучобе. Наталля Зофія Лемеш узнагароджана была за культурна-грамадскую працу ў карысць беларускай нацыянальнай меншасці. Заўважаны былі яе дасягненні ў арганізацыі і вядзенні беларускіх мерапрыемстваў і супрацоўніцтва з тыднёвікам „Ніва". Агнешка Пуц і Юстына Грыцюк атрымалі ўзнагароды за актыўную дзейнасць у карысць моладзі ў Брацтве праваслаўнай моладзі (Юстына Грыцюк былая, а Агнешка Пуц сённяшняя старшыня брацтва) і за валанцёрскую працу ў Доме міласэрнасці „Самаранін".

— Мы рады, што можам вылучыць тры вучаніцы, якія памагаюць іншым. Вы атрымалі ўзнагароды за вашае чалавецтва, — сказаў Эгон Швільгін, уручыўшы вучаніцам вылучэнні. Спартсменам перадаў ён мячы і спартыўныя прылады ды запрасіў белліцэістаў на спартыўныя спаборніцтвы ў нямецкую школу. Прапанову настаўнікі і вучні прынялі з радасцю.

— Узнагарода была для мяне неспадзеўкай, але паказвае, што заўважылі маю работу. Атрымаўшы гэтую ўзнагароду бачу, што іду ў добрым напрамку, — заявіла Зося Лемеш.

У час падвядзення вынікаў вучобы аказалася, што самых лепшых поспехаў дабіліся вучні I „а" класа белгімназіі, у якіх сярэдняя ацэнка атрымалася на ўзроўні 4,42. Сярод ліцэістаў найлепш вучыліся вучні I „б" класа, якія дабіліся сярэдняй ацэнкі 4,27. Ва ўсіх белгімназістаў атрымалася сярэдняя ацэнка 4,07, а ў белліцэістаў — каля 4. Найлепшыя вучні атрымалі з рук дырэктара Яўгена Сачко пасведчанні з бела-чырвонай палоскай і кніжныя ўзнагароды. Узнагароды атрымалі таксама асобы, якія дзейнічалі ў школьным самаўрадзе, рэдакцыйным калектыве „Слоўца", прадметных гуртках і перамагалі ў конкурсах. Дырэктар уручыў узнагароды членам гімназічнага музычнага калектыву і „Знічкі". Стыпендыю прэм'ер-міністра Лешка Мілера атрымала вучаніца I „а" класа Іаанна Врублеўская, у якой сярэдняя ацэнка па вучобе — 4,96. У гэтым годзе заняла яна першае месца ў Алімпіядзе па беларускай мове і дайшла да ваяводскіх элімінацый Алімпіяды па польскай мове. Дзейнічае яна ў Ваяводскім маладзёжным парламенце.

Пасля ўрачыстага развітання са школай вучні спаткаліся з выхавацелямі і атрымалі пасведчанні. У гэтым навучальным годзе ўсе вучні паспяхова закончылі адукацыю і былі пераведзены ў вышэйшыя класы. Можна спадзявацца, што пасля візіту нямецкай дэлегацыі наладзіцца супрацоўніцтва паміж моладдзю абедзвюх краін.

Аляксей Мароз

Беларускі цэнтр у Познані

Чытачы „Нівы" ўжо мелі магчымасць пазнаёміцца са звесткай пра існаванне Беларускага культурна-навуковага цэнтра ў Познані. Яго намаганнем адбылося тут святкаванне 85 угодкаў абвяшчэння БНР.

17 чэрвеня адбыўся паказ кінастужак пра Беларусь. Моладзь Цэнтра рыхтуецца таксама ехаць на „Басовішча" ў Гарадок. Студэнты — гэта яны ў большасці з'яўляюцца членамі Цэнтра — і старшыня гэтага згуртавання Віталь Воранаў, разлічваюць на сяброўскія кантакты з моладдзю іншых гарадоў.

Разглядаецца тут задума заснаваць г.зв. „Палічку-Бібліятэку". Каб збіраць літаратуру пра Беларусь на беларускай, так і польскай мовах. „Было б гэта вельмі карысна, — гаворыць В. Воранаў — і для студэнтаў з Беларусі і для навуковага асяроддзя Познані". Па-мойму, польскамоўных матэрыялаў на гэтую тэму крыху знайшлося б і ў Познані, на беларускай — праблема. Пра гэта асмелюся параіцца з чытачамі „Нівы": дзе такую літаратуру шукаць? У Беластоку? У Варшаве? За інфармацыю на гэту тэму буду ўдзячны.

Анатоль Маўчун

Весткі з Арлянскай гміны

Нечыстоты возяць у Бельск

Прадаўжаецца распачатая ў мінулым годзе перабудова ачышчальні вадкіх нечыстот у Орлі. Мясцовасць не мае каналізацыі і ачышчальня забірае нечыстоты ад школьнага комплексу, шматсямейнага, толькі часткова заселенага жылога блёка і трох прыватных дамоў. Таму здадзеная ў 1992 годзе ў карыстанне ачышчальня з-за недахопу дастатковай колькасці нечыстот пасля некалькіх гадоў выбыла са строю. Цяпер нечыстоты трэба завозіць аж у Бельск-Падляшскі.

Як паінфармаваў гмінны інспектар будаўніцтва Ілья Мартыновіч, мадэрнізацыю ачышчальні выконвае сувальская фірма PRESS. Ужо выканана электрасетка і перапампоўня, а ўсярэдзіне вядуцца падрыхтоўчыя працы для ўстаноўкі ачышчальнай апаратуры, якая завозіцца з Італіі. Заканчэнне прац прадбачваецца на снежань г.г. Кошт перабудовы — 595,52 тысячы злотаў. На гэтую мэту гміна атрымала толькі 30 тыс. зл. датацыі з Ваяводскага фонду аховы асяроддзя ў Беластоку. Асноўнае фінансаванне мерапрыемства будзе адбывацца за кошт крэдытаў: 60 тыс. зл. з банка і 370 тыс. зл. з Нацыянальнага фонду аховы асяроддзя; пасля сплаты 70% апошняга рэсурсу рэшта яго — 30% — можа быць пагашана.

Многа памірае

У першай палове г.г. адзначана рост колькасці сконаў. У канцы снежня 2002 года ў гміне пражывала 3 727 асоб. Ад пачатку студзеня да 15 чэрвеня памерла аж 35 чалавек. У адным Арлянскім прыходзе на працягу двух тыдняў памерла 9 асоб; такога, як згадваюць арляне, яшчэ не бывала. Адыходзяць не толькі пажылыя, але і людзі ў росквіце сіл. У адзін тыдзень памерла двух працаўнікоў Гміннай управы, у іх ліку войт Ян Добаш.

Ад студзеня да паловы чэрвеня нарадзілася ў гміне 15 дзяцей і гэта нямала ў параўнанні з недалёкім мінулым. Бацькі называюць сваіх дзяцей па-рознаму, напр. Марта, Іаанна, Сільвія, Алівія, Дарыя, Давід, Якуб, Базыль...

Прыбывае інвалідаў

Як паінфармавала Ірэна Пішчатоўская, загадваючая Гмінным асяродкам сацыяльнай дапамогі ў Орлі, у летні перыяд бедным асобам не прызначаецца перыядычных засілкаў. Прычынай гэтаму недахоп сродкаў ды і патрабуючыя павінны шукаць сабе нейкага занятку ў гаспадароў.

Расце колькасць асоб з правам на пастаянны засілак з II групай інваліднасці; цяпер такія засілкі атрымлівае 34 асобы. Паслядоўна разглядаюцца заяўкі на мэтанапраўленыя засілкі, але гэта сціплыя сродкі, якія прызначаюцца галоўным чынам на куплю школьных падручнікаў.

Міхал Мінцэвіч

Шмат нас

Вынікі перапісу насельніцтва з 2002 года для беларусаў вельмі аптымістычныя. Ёсць нас у Польшчы 48,7 тысяч. Амаль кожны трэці праваслаўны на Беласточчыне акрэсліў сябе беларусам. Ведаючы настроі ў Беластоку я спадзяваўся, што вынік атрымаецца напалову горшы.

Калі ў 1983 г. я ўпершыню спрабаваў акрэсліць адсотак беларусаў сярод праваслаўных, пасля шматмесячных апытанняў выйшла мне, што толькі 26,3% назвала сябе беларусамі, 28,5 — палякамі, 31,5 — рускімі, 2 — украінцамі, астатнія — 11,3% — тутэйшымі. Дзесяць гадоў пазней сацыёлаг Анджэй Садоўскі правёў больш грунтоўныя даследаванні і атрымалася яму, што адсотак беларусаў большы толькі на адзін працэнт. Рашуча пабольшыўся толькі адсотак палякаў. Праз дзесяць гадоў пераважная большасць рускіх і тутэйшых назвала ўжо сябе палякамі. Быў гэта перыяд узнікнення і вельмі актыўнай дзейнасці беларускіх арганізацый. Аказваецца, што не мелі яны ніякага ўплыву на тутэйшых ці рускіх, якія маланкава, у новых палітычных умовах, пераўтварыліся ў праваслаўных палякаў. Паспрыяла гэтаму таксама палітыка царкоўных улад, якія шукалі шляхоў прыстасавання да новай палітычнай сітуацыі пасля 1989 г.

Мінулагодні перапіс паказаў толькі замацаванне існуючага падзелу сярод праваслаўных — на беларусаў і палякаў. Зразумела, што адзіны фактар, які стрымоўваў і ў будучыні можа запавольваць працэс паланізацыі гэта беларуская культура і актыўнасць яе стваральнікаў. На якую-небудзь дапамогу, хаця б маральную, з боку лукашэнкаўскай Беларусі нельга спадзявацца. У Польшчы адчуваецца, што ўзрастае хваля нацыянальнага рамантызму. Заўсёды ў такой сітуацыі беларусы імкнуліся недзе схавацца. Гэтая маскіроўка зусім, дарэчы, непатрэбная, таму што і так, нават у такой *вёсцы* як Беласток, усе пра ўсіх усё ведаюць.

Найбольш нечаканымі атрымаліся вынікі перапісу ў заходніх ваяводствах. Пасля доўгіх дзесяцігоддзяў мэтанакіраванай асіміляцыі 175 тысяч сілезцаў не захацела быць толькі этнічнай польскай групай і назвала сваю нацыянальнасць сілезскай. Хаця ніхто ў краіне такой нацыянальнасці не прызнае, але вынік перапісу паказвае, што яна існуе ў сапраўднасці і гэта ўжо не толькі выдумка некалькіх дзеячаў. Таксама 5,1 тыс. кашубаў адмовілася быць этнаграфічнай польскай групай і выразна прадэманстравала нацыянальныя імкненні. Ва ўмовах ліберальнай палітыкі апошніх гадоў, вымушанай, дарэчы, патрэбамі інтэграцыі з Еўрапейскім Саюзам, на захадзе краіны сярод аўтахтонаў выразна пачалі ўзнікаць структуры спрыяючыя рэгіянальнаму сепаратызму. Больш за 750 тысяч грамадзян, у большасці з заходніх ваяводстваў, зусім не захацелі назваць свае нацыянальнасці. Палякі не маюць ніякіх прычын яе скрываць. Усё паказвае, што пры спрыяльных умовах праз пару гадоў колькасць сілезцаў і немцаў можа рашуча пабольшыцца. Адначасова сведчыць гэта і пра тое, што палякі не маюць ніякай прыцягальнай сілы як нацыя на сваіх заходніх акраінах.

Найбольш паспяхова прайшла асіміляцыя ўкраінцаў. Аказваецца, народ пазбаўлены свае зямлі і раскіданы на шырокай тэрыторыі не мае вялікіх шанцаў захаваць тоеснасць нават пры спрыяльнай ім палітыцы дзяржавы. Пасля вайны на тэрыторыі Польшчы асталося не менш 160 тысяч украінцаў і лэмкаў. Перапіс паказаў што першых асталося толькі 31 тысяча, другіх — 5,9 тысячы. Кампактнасць пражывання беларускага насельніцтва ў Гайнаўскім і Бельскім паветах дала добры вынік беларусам падчас перапісу. Там нават чыноўнікі не асмельваліся навязваць людзям г.зв. дзяржаўную нацыянальнасць. У Беластоку рассеянасць беларускага насельніцтва выразна дае пачуццё пражывання ў польскім нацыянальным акружэнні. Схільнасць прыстасавацца да патрабаванняў гэтага акружэння і адсутнасць нацыянальнай салідарнасці ўплывае на яго пастаяннае скарачэнне.

Наступны перапіс насельніцтва павінен адбыцца ў 2012 г. Усё паказвае, што ў Польшчы паменшыцца адсотак палякаў. Патэнцыяльных праваслаўных палякаў надта мала, каб маглі яны кампенсаваць затраты на захадзе краіны, дзе вельмі дынамічна этнічныя групы пачалі пераўтварацца ў маладыя народы.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Вакацыйны пейзаж

У апошні час наракаў я на сваё раздражненне ў сувязі з нахабнасцю і гаманлівасцю маладых людзей у маім мікраёне-гета. Трохі акрыяў, калі пачуў, што на канікулы (з-за беднасці) выязджае сёлета ледзь каля дзесяці працэнтаў дзяцей і моладзі. Шкада мне апошніх дзевяноста працэнтаў. Што ім рабіць у горадзе, як не праседжваць на лаўках пад пад'ездамі, ламатаць мячом у сцены сметніц ці пад вокнамі кватэр падскокваць на роліках, на што я так скардзіўся. Рэдкія прапановы дамоў культуры не настолькі прыцягальныя, каб забяспечыць адпаведныя пацехі. Часцей чым заўсёды запаўняюцца гімназістамі, далёка да васемнаццаці гадоў, півярні і карчмы. Найбольш зарабляюць піваварні. Амаль нідзе бармены не звяртаюць увагу на папераджэнні ў месцы сваёй працы: „Моладзі да 18 гадоў алкаголь не прадаецца", урэшце, пэўна, думаюць: піва — не алкаголь. Практыка, аднак, паказвае, што на піве не канчаецца. Пасля вячэрніх вяртанняў з корчмаў ды півярняў юнакі не ламочуць мячом у сцяну сметніка, а таго, хто трапіць у рукі.

Аднагодкі меншых дзецюкоў, якія таксама цяпер засталіся на канікулах пад блёкамі, калісьці выязджалі на летнікі-„калёніі". Калі не, дык хоць хадзілі на „паўкалёніі". У мяне, для прыкладу, у міжблёкавую святліцу, дзе цяпер уздымаецца аграмадны жыллёвы дом. Цяпер большасць з іх пад маімі вокнамі гайдаецца на арэлях. Дарэчы, „гімнастыка" на „трапаках" выйшла з моды. Можа, таму, што яны стаяць пры сметніках, у якія забіваюць мячы іх старэйшыя калегі. Аднак арэльны кашмар на маім мікраёне зафундавала, вось, адміністрацыя. Спрабавала іх падсучасніць. Падчапіла драўляныя сядзёлцы, не так, як дагэтуль, да стабільных прэнтаў, а да ланцугоў спалучаных металёвымі коламі. Забава канчаецца тым, што малечы, спрабуючы пагайдацца, звальваюцца з грукатам і плачам на зямлю.

Вельмі цікава, што ў суседстве блёкаў майго мікраёна — вялікія пляцоўкі аднаго са спартклубаў. Калі праходжу з сабакам побач, не бачу там нашай моладзі. Не на пляцоўках. Праседжвае на лаўках пастаўленых на мураву, пакурвае цыгарэты.

Вечарамі ў канікулы мала тут бяспечна, з пункту гледжання старэйшых. Змрок пяцёркам, сямёркам ці дзесяткам групак быццам дазваляе на ўсё. Вось я ў апошні час заўважыў, як такая група наткнулася на старушку. Пакульгаць мусіла бабулька ў зусім іншы бок, чым намервалася, убачыўшы перад сабою на вузкім тратуары ідучую лавай і пакрыкваючую пяцёрку. Спытаеце, што робіць паліцыя, якая, згодна з гарантыяй чарговых гарадскіх ды ваяводскіх камендантаў мела „выйсці на вуліцы"? Раз я бачыў паліцыйную машыну з парай службоўцаў. Сталі так, што іх не было відаць. Можа і гэта някепская ідэя. Толькі што і яны нічога не бачылі і не чулі.

Рады мікраёнаў, пасёлкаў, беластоцкія ўлады, арганізацыі і рознамасныя згуртаванні ўжо ад даўжэйшага часу не маюць чаго запрапанаваць дзецям і моладзі ў бяднеючай рэчаіснасці. Трэба ім, значыць, шукаць ідэй і грошай на пабольшванне бяспекі. А на гэта і ідэй, і асабліва фінансавых сродкаў не хапае. Думаю, аднак, што перш за ўсё няма ніякай канцэпцыі. Чаму ж, аднак, здзіўляцца? Тым часам нават эліта беластоцкай выканаўчай улады не спраўляецца з іншымі, часовымі праблемамі. На прыпынку адной з больш тлумных вуліц, якая прабягае праз мой пасёлак, чакаў я пару дзён таму аўтобуса. Было каля 10. У поясе перад прыпынкам, на паўтара метра ад берага тратуара ў глыб вуліцы рабочыя па загадзе гарадскіх чыноўнікаў вылівалі свежанькі цёплы асфальт. Аўтобусы затрымліваліся, як заўсёды, насупраць прыпынку. Пасажыры, каб увайсці, мусілі ўступіцца ў толькі што выліты асфальт. Адразу паявіліся ў ім сляды, бы адбіткі ў галівудскай алеі зорак. І як тут гаварыць аб грашах на арганізацыю вакацыйнага часу для дзяцей і моладзі, калі такая бяздумнасць мусіць іх, тыя грошы, зжырацъ.

Мацей Халадоўскі

Недавер да Еўрасаюза

У Чыжоўскай гміне толькі 31,77% выбаршчыкаў прыняло ўдзел у рэферэндуме ў справе далучэння Польшчы да Еўрасаюза. Многія гаспадары і пенсіянеры, якія засталіся дома, былі супраць уступлення нашай краіны ў еўрапейскія структуры. Не вераць яны, што іх голас можа мець уплыў на ход падзей. Большая яўка была сярод маладых. З ліку галасуючых 52% падтрымалі ідэю ўступлення Польшчы ў Еўрасаюз, а 48% — было супраць. У Чыжоўскай акрузе было наадварот — 151 асоба выказалася за Еўрасаюз, а 153 — супраць (1 голас быў няважны).

У рабочы дзень на вуліцы ў Чыжах сустракаю, у асноўным, старэйшыя асобы. Мужчына, які просіць назваць яго Васілём, кажа, што галасаваў супраць уступлення Польшчы ў Еўрасаюз.

— Напэўна ў Еўрасаюзе не будзе лепш. Кожны хоча многа, а яго няма. Будзе яшчэ большы непарадак, чым цяпер, — кажа спадар Васіль.

Ян Ахрымюк, які спявае ў калектыве „Чыжавяне", адмоўна ацэньвае перамены, якія адбыліся ў нашай і суседніх краінах. Не прыняў удзелу ў рэферэндуме, бо не верыць у яго станоўчыя рэзультаты.

— За чым жа я меў галасаваць? Да чаго ж давялі зараз вёску. На 200 дамоў у Чыжах засталося можа 10 маладых гаспадароў. Невядома, што будзе далей, бо людзі жывуць з дня на дзень, — кажа Ян Ахрымюк.

— Пры камуне людзі жылі добра і калі б так далей было, то маладыя людзі заставаліся б гаспадарыць, — заяўляе жонка Яна Ахрымюка. — У нас сын застаўся на гаспадарцы, але цяжка яму будзе. Аборы ў нас няма і хіба ад 2004 года перастануць прымаць нашае малако (няма ўмоў для даення, якія патрабуюцца ў Еўрасаюзе — А. М.). Пры камуне многія гаспадары будавалі дамы, аборы, клуні, куплялі сельскагаспадарчыя машыны, а зараз даход з сельскагаспадарчай прадукцыі вельмі малы і цяжка разбудоўваць гаспадарку.

На лавачцы каля свайго дома сядзіць мужчына, жанчына корпаецца ў агародчыку.

— Я супраць галасаваў, бо праўды ў нас няма. Лічу, што ў Еўрасаюзе яшчэ горш будзе. Калі малако купляюць па 50 грошай, а ў магазіне прадаюць больш за залатоўку, то як можа быць лепш, — тлумачыць пажылы мужчына. Жанчына ўчуўшы пра палітыку, пачынае крытыкаваць урад і жаліцца, што атрымлівае толькі 500 злотых пенсіі.

Трыццаціпяцігадовы мужчына, якога спатыкаю на вуліцы заяўляе, што таксама галасаваў супраць уваходу Польшчы ў Еўрасаюз.

— У чым жа мне гэты Еўрасаюз дапаможа. Абрэзваюць даплаты да збожжа, а калі Польшча ўвойдзе ў Еўрасаюз можа быць яшчэ цяжэй з яго продажам. Тыя, якія зараз канчаюць школу, можа і дачакаюцца лепшага жыцця, але старэйшым цяжка будзе, — кажа мужчына.

На панадворку солтыса Андрэя Тыханюка сустракаю жанчыну, якая прывезла на продаж трускалкі. Заяўляе, што галасавала за ўступленне Польшчы ў Еўрасаюз. Хаця яна не перакананая, што ў Еўрасаюзе палепшае доля жыхароў вёскі, то мае надзею, што будзе лепш жыць яе дзецям, якія жывуць у Беластоку і Гайнаўцы. Солтыс Андрэй Тыханюк наракае, што сёлета слабы ўраджай трускалак. Скупіў толькі 30 кілаграмаў і не спадзяецца на скупку большую за 200 кілаграмаў. Цана, 4 злоты за кілаграм, большая за мінулагоднюю. Аднак, не дае такога даходу, які быў раней. Спадарства Тыханюкі куплялі тады ў сезоне па 1 800 кілаграмаў. Калі Андрэй Тыханюк канчае купляць трускалкі стаўлю пытанне пра рэферэндум.

— Я галасаваў супраць уступлення Польшчы ў Еўрасаюз, бо ўсё ў ім мне не падабаецца. Калі ўступім у Еўрасаюз дык на нашай вёсцы на 100% будзе горш. Абмяжуюць скупку малака і збожжа, на якое цана можа панізіцца. Нашым малочным кааператывам цяжка будзе прадаваць сваё малако ў Еўрасаюзе, а з іншых краін будуць пхаць нам сваё малако. Не думаю таксама, што ў горадзе будзе лепш, калі ў Францыі ці Нямеччыне такое вялікае беспрацоўе, — рашуча заяўляе Андрэй Тыханюк і пераходзіць да штодзённых праблемаў. Інфармуе, што пасля асенняй засухі і зімовых марозаў будзе слабы ўраджай на азімае збожжа. У Чыжах каля 40% азімай пшаніцы і пад 80% рапсу заараліі, бо высахлі яны і вымерзлі. Войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк, якога наведваю перад канцом рабочага дня, паясняе, што слабое зацікаўленне рэферэндумам было таксама ў суседніх гмінах Гайнаўскага павета.

— Старэйшыя асобы менш зацікаўлены зменамі ў нашай краіне і з недаверам глядзяць на Еўрасаюз. За ўваход у еўрапейскія структуры найчасцей галасавалі людзі маладыя, — заяўляе войт.

Аляксей Мароз

„Тутэйшыя” ў Беластоку

У рамках святкавання 50-годдзя Беластоцкага лялечнага тэатра, якое спадарожнічала сёлетнім Дням Беластока, на сцэне беластоцкай Тэатральнай акадэміі прэзентаваўся Гродзенскі лялечны тэатр. Чацвёрка акцёраў прадставіла трагічна-смешных „Тутэйшых” паводле Янкі Купалы.

Камерная зала тэатральнай школы запоўнілася з берагамі; арганізатары мусілі нават дастаўляць крэслы, шмат гледачоў стаяла. Публіка была сапраўды міжнародная. Каля нашых беларусаў і палякаў мясцовых і з усяе Польшчы, у зале заселі заходнія — чужаземцы-лялечнікі, якія прыехалі на юбілей БЛТ. А са сцэны далятала мова не толькі беларуская, а і руская, польская, нямецкая, не ўспамінаючы аб г.зв. жыдлачэнні. Мовы, якімі дзесяцігоддзямі паслугоўваліся ў Мінску і розных рэгіёнах Беларусі, уперамешку заваёўванай рускімі, палякамі, немцамі...

Спектакль Гродзенскага лялечнага тэатра, падрыхтаваны з нагоды 120-годдзя ад дня нараджэння Янкі Купалы, паставіў Мікола Андрэеў. Іграе ў ім чацвёра акцёраў, сярод іх вядомы бард Віктар Шалкевіч. У свет беларушчыны, праблем з беларускай тоеснасцю ў шматкультурным Мінску ўводзіць ужо заслона. Куртына — плахта лёгкага матэрыялу з намаляванай картай Беларусі, грудай камення з зазначанымі Мінскам, Гроднам, Віцебскам і Магілёвам. Хоць, калі заслона ўздымаецца, здаецца, што тэатральны свет „Тутэйшых” — плоскі, з часам (разам з развоем акцыі) набірае ён глыбіні. Акцёры і іх лялькі запаўняюць амаль усю прастору сцэны, іграе кожны элемент дэкарацыі, разам з вісячымі іконамі, якія з другога боку скрываюць падзаступнікаў чырвонай рэвалюцыі, што паказваюцца публіцы ў хвіліны сцэнічных, „гістарычных” перамен. Аб беларускасці дыскутуюць між сабою паляк і рускі. Беларус са сваёй беларускасцю — у ёй бы тая, калі цытаваць з іншай рэчаіснасці аднаго з польскіх генералаў — кветка да кажуха. Відаць гэта асабліва ў сцэне, калі акцёры, іграючыя паляка і рускага, выходзяць на сцэну з біноклямі, каб, як кажа адзін з іх, „паглядзець сапраўдны беларускі тып”. Што і руш дыскусіі і спрэчкі пераносяцца з лялек — герояў літаратурна-тэатральнага свету — на саміх акцёраў — герояў беларускай рэчаіснасці з даўніх гадоў і сённяшняга часу. Кахаючых, як і Янка Купала, свой народ і айчыну. Не без прычыны, пэўна, твары галоўных лялек вельмі падобныя да твараў іх аніматараў. Аглядаючая разам са мною п’есу сяброўка — тутэйшая беларуска, заўважыла ў пэўны момант, паказваючы на аднаго з акцёраў: „Які ж ён падобны на Лукашэнку!”

Не без дайрацыі была гэта асацыяцыя, бо, як можна пачуць у канцы спектакля, уся справа, хоць у галоўным расказвае аб паблытаных лёсах Беларусі, у істоце трактуе аб сённяшнім часе, дзе беларуская тоеснасць дыскрэдытуецца асобай, на якую той акцёр сапраўды падобны. Горка гучаць фармулёўкі беларускіх герояў п’есы даходзячыя са сцэны, інспіраваныя Янкам Купалам: „Нам і без мора ёсць дзе ўтапіцца”. Горка застаецца пасля сцэны, калі беларус вучыцца аратарскага мастацтва з падшэпту не зусім сваіх перакананняў. Горкі смех спадарожнічае сцэне, у якой адзін з герояў лузае семкі і сплёўвае імі налева і направа, што на іншага з герояў, паклоннікаў рэвалюцыі, наводзіць думку: „Хто да рэвалюцыі мог лузаць семкі? А цяпер могуць усе і ўсюды!”

„Тутэйшых” гродзенскі тэатр павінен паказваць у Беластоку часцей. Яго павінна пабачыць перш за ўсё больш палякаў. Можа тады хоць бы частка з тых, якія цвердзяць, для прыкладу, што ў Польчшы няма беларусаў, а толькі палякі беларускага паходжання, зразумее паблытаны ды што і руш адпакутаваны лёс тутэйшых і тамтэйшых братоў беларусаў. Можа тады не будуць перад беларусамі размахваць „вялікапанскай шаблечкай”, бы са сцэны ў гродзенскім спектаклі герой-паляк.

Пастаноўка была ўспрынята гучнымі апладысментамі. Асабіста віншаваў стваральнікаў спектакля Сакрат Яновіч, дзень раней ушанаваны прэзідэнтам Аляксандрам Кваснеўскім узнагародай імя Анджэя Дравіча. У прысутнасці публікі шчыра паціснуў далоні акцёрам.

Мацей Халадоўскі

Літаратурна-мастацкая старонка № 519

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Мастак і музыка Алесь Лось спяваў вершы. На другім плане паэт і выдавец Міхась Скобла

Ларыса Геніюш у Карнага

12 чэрвеня г.г. Кафедра беларускай культуры і Беларускае аб’яднанне студэнтаў сарганізавалі вечар прысвечаны 20 гадавіне ад смерці Ларысы Геніюш (памерла 7 красавіка 1983 г.). Залы Музея скульптуры Альфонса Карнага, які не першы раз адчыняе свае вароты беларусам, запоўніліся публікай — тутэйшымі беларусамі, сябрамі і знаёмымі сям’і Геніюшаў, студэнтамі філфака, літаратарамі з „Белавежы”. Быў гэта вечар успамінаў і песні. Міхась Скобла расказваў пра лёс Ларысы Геніюш, яе творчасць і ўспрыняцце яе ў сучаснасці, прадставіў апошнія яе кнігі, у тым выданне ў „Беларускім кнігазборы”, да якога меў дачыненне, збіраючы творы і ваюючы, каб паказаліся яны ў арыгінальным, не пашаткаваным цэнзурай варыянце. Алесь Лось заспяваў пад гітару песні на словы вершаў Л. Геніюш і прадставіў дыск з запісамі гэтых песень; на гэтым дыску можна пачуць і голас Ларысы Геніюш, якая чытае свой верш. З успамінамі далучыўся Віктар Швед, які асабіста пазнаў ужо легендарную для большасці з нас постаць; вядомы беластоцкі літаратар і аўтар для дзяцей з вялікім хваляваннем успомніў таксама і іншыя сустрэчы з вялікімі жанчынамі Беларусі, м.інш. з жонкай Купалы Уладзіславай Францаўнай Станкевіч і Канстанцыяй Буйло. Міра Лукша з вялікім хваляваннем прачытала свой верш прысвечаны сыну Ларысы Геніюш, Юрку, „белавежцу”, беластоцкаму доктару, які перажыў сваю маці на два гады.

Вечарыне спадарожнічала выстава прысвечаная паэтэсе. Знайшліся на ёй м.інш. здымкі з пражскага перыяду яе жыцця, верш, дагэтуль вядомы толькі ў скарочанай версіі (арыгінальны машынапіс), лісты з Зэльвы Юзафу Александровічу (Найдзюку) у Інаўроцлаў і ўнуку Міхасю ў Беласток, уласнаручна аздобленыя бабуляй Ларысай Антонаўнай каляровымі малюнкамі жывёл, птушак і дзяцей; нездарма стаў ён выдатным ветэрынарам ды добрым чалавекам, як заўважыла крытык Тэрэса Занеўская.

(куша)

Міра Лукша

Матычка

Прыклыпала Люба з поля, укапаўшы кошык маладое бульбы. Павесіла матычку на плоце пад студняй. На кошык лінула ўстаялай вадой з вядра, падчэпленага кароткім ланцугом да жорава. Прысела на камені, узялася скрэбці бульбіны з тонкае лупіны. Трэба рыхтаваць абед. Колькі тае бульбы трэба для аднае ды старога Костуся. Хлопцаў няма ўжо другі дзень. Пэўна, п’юць дзе. Такія хлопцы, абодвум добра за сорак. Адны з маладзейшых у вёсцы. Робяць на гаспадарцы. Жывуць за матчыну пенсію, бо з чаго. За малако хапае толькі на падаткі. Жонак няма, бо, калі б была ў якога, грош трэба было б і ёй на КРУС. А так то і „бычковае” плаці, а якія з іх бычкі! Люба ўсхліпнула, выцерла нос запыленым рукавом. Што тут хліпаць, плакаць. Усе жанкі плачуць. То з-за чалавека кепскага, то з-за сыноў. То хата валіцца, то платы, а няма каму падперці. А ўзяць якому ды ўперыць у дурную галаву! Ды што такога біць — пальцам ткнеш, дык зваліцца як сноп. А ў Любы яшчэ і бацька е, Костусь, такі самы, як гэтыя нагавічнікі, дзед ім. Адно што стары зусім, з хаты ледзь выходзіць. Гэты то і да гаспадаркі не дакранецца, бо не мае сілы, а жондзіць хоча. Пенсію на кніжцы трымае. Заўжды трымаў грош, на баб выдаваў чужых. Любу, адзіную дачку, гнаў да работы, і разам з ёю прымака, Зюню, хай яму зямля пухам будзе, як у жыцці цяжкі быў. І зямлю перапісаў на старэйшага ўнука. І цяпер шчэрыцца штучнай пашчэнкай: марнатравяць. Ну, такія гаспадары! Каб што калі паклалі на месца!

Над Любай нахіліўся крывы цень.

— Любо, уміраці буду, — прасіпеў бацька і дакрануўся да яе пляча халоднай рабой далонню. — Кліч унукаў. Буду распараджацца.

— Няма хлопцаў. Мне скажыце, што і як, тату.

— А ты што за адна?!

— Тату, ваша дачка, Люба.

— Гэта наша мужчынская справа, дурная ты бабо. Ідзі прэч, сатана.

— Тату, як жа ж вы так... То ж я вас дагледжваю... Ніколі вы мяне не любілі, а я ўсё жыццё вам рабіла, як той конь.

Стары ўхапіў Любу за хустку.

— Прэч, сволач! Ідзі ты да д’ябла. Тут няма твайго нічога.

Люба схапіла матычку з плота, замахнулася. Стары зваліўся на мокры пясок пад студняй.

Сяргей Чыгрын

Васілю Быкаву

Вайна — гэта знак бяды,
Яе немагчыма забыць.
А мёртвым не трэба вады,
А мёртвым ужо не баліць.

Праз порах і дым вайны,
Праз пасткі
І праз вышыні
Ішлі батальёна сыны
І воўчую зграю крушылі.

Абеліскі вітаюць зару,
Жураўліныя крыкі ачнуцца...
Праз Альпы у Беларусь
Пайсці, дажыць і вярнуцца.

Уладзімір Саўчук

Рэха

Удзельнікам „белавежскай” канферэнцыі

мы ляцелі
у свет халодны
па загонах яшчэ свежых
сёння вяжуцца тут думкі
несмяротнай Белавежы

вырастаюць словы праўды
ў каранёў спелай таполі
час пакажа, хто з магнатаў
бачыць нас у час нядолі

лёс пакажа ці даспелі
глянуць нацыі нашай у вочы
за мяжою цяжкай праўды
Нёман ціхі і дзявочы

8 чэрвеня 2003 г.

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Гарадоцкія „Рэпетыцыі”

Гульня ў тэатр выдатна ажыўляе атмасферу на ўроках беларускай мовы. У ПШ у Гарадку, дзе на ўроках роднай мовы ходзіць горстачка навучэнцаў, даўно дацанілі гэтую форму. Каб забяспечыць неабходныя сродкі для пазаўрочных заняткаў, настаўніца Тамара Бялькевіч піша праекты, шукае спонсараў.

На агляд у Гайнаўку яны прыехалі з цікавай пастаноўкай. У п’есе прыняў удзел увесь шосты клас — разам васемнаццаць асоб. З вучнямі выступала на сцэне таксама настаўніца. Спектакль п.з. „Рэпетыцыі” паказваў у мастацкай форме працу над спектаклем.

— Мы ўзбагацілі сцэнарый сваімі назіраннямі, — кажа Тамара Бялькевіч.

Пастаноўка гарадоцкіх вучняў спрычынілася ў натуральны спосаб да прысваення слоў і паняццяў звязаных з тэатрам. З другога боку, „Рэпетыцыі” — сапраўды спалучаюць гульню і навуку. Спектакль цікава было б паказваць іншым навучэнцам беларускай мовы.

Гарадок вылучыўся не толькі формай тэатральнага пераказу. Увесь калектыў выступіў у кашульках з назвай свайго тэатральнага гуртка — „Мінутка” (на здымку).

Зорка

Поле

Ці ёсць нічыя зямля? Калі яе ніхто не абрабляе і не хоча браць, каб штосьці на ёй вырошчываць? Ёсць. Асіным дзеду з бабай гэта справа была зусім незразумелая. Праўда, яшчэ да нядаўна. Калі самі былі гаспадарамі, рабілі, колькі сілы хапіла. А захварэлі, дык аддалі зямлю дзяржаве. І іхная зямля знайшла добрага гаспадара, суседа, яшчэ маладога, старанлівага, працавітага. Дык сэрца не баліць, калі глядзіш на ўраджайнае поле, пару дзесяткаў гадоў дагледжванае табою, пешчанае. І поле аддзячвае табе плёнам.

Часу больш цяпер у бабы Зосі і дзеда Ануфрыя. Гаспадараць крыху на сваім загоне, што сабе пакінулі, трымаюць якую курку, свінку. А дзяцей у іх трое, дык наведваюць іх, калі тыя да іх не едуць. Прыехалі, вось, у чэрвені да Асі ў Беласток. У госці. А госцем быць адно — нудноватая справа. Асабліва калі яшчэ школа канчалася, дык у хаце нікога не было. Паездзіла-пахадзіла пасля Ася з дзедкам і бабцяй па горадзе, паглядзелі тое-сёе, а ім — дахаты хочацца. На сваё палетка.

— Давайце, паедзем у лес па бубкі. Па трускалкі, — запрапанавала Ася.

— У лес? — здзівілася бабуля. — Там жа суніцы растуць, не трускалкі.

— Гэта ў Ігнатках. Гарадскі аўтобус едзе, „дзесятка”. На полі растуць, кожны можа ехаць і збіраць.

— А як жа ж чужое браць? — здзівіўся дзед.

— А гэта не чужое. Яно нічыё. Калісь там калектыўная гаспадарка была, ліквідавалі яе, палеткі пакінулі... Цяпер там нічога не робяць. А трускалкі растуць. І кожны, хто хоча, можа сабе іх браць.

Праўда, кінутае поле пярэсцілася беластачанамі. Пасля працяглага дажджу палетка абсохла. Людзі ў спешцы збіралі нават зеленаватыя ягады. Рушылі і Ася з дзедам ды бабкай па „бубкі”. Назбіралі вядро нічыіх трускалак.

— Едзем, Зоська, дадому. Ася, збірайся. Чаго па чужых палетках бадзяцца! — нецярплівіўся ўсхваляваны дзед ужо ў гарадской „дзесятцы”.

— Не магу ўжо дачакацца! — засмяялася ўнучка.

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Ніна Мацяш

Арэхаўка

— Птушачка арэхаўка,
Чорныя ножкі,
Не ўвіхайся, пачакай,
Пагамонім трошкі!

— Няма часу, бач — нясу
Жолуд і арэшкі,
Пасадзіць прасіў барсук
Ля ягонай сцежкі.

Мара ёсць у барсука:
На сваім падворку
Гаспадыню сустракаць —
Панечку вавёрку.

Пасаджу яму дубок
І аж тры ляшчыны,
Хай наладжвае панок
Панне пагасціны!

Аўдотка

„Цюрлі, цюрлі, цюрлі”, —
нясецца ўшыр ад зямлі.

Хто гэта, голас чый
журбуе так уначы?

Хто будзіць лугі, палі
самотным „цюрлі, цюрлі”?

Ды гэта ж птушка аўдотка!
Жаліцца нам, сіротка,
што знікла яе радня,
цюрлікаціме да дня...

Вершы Віктара Шведа

У летнім лагеры

У летні дзень гарачы
Бацька ў лагер дзіцячы
Прыехаў адведаць сына
І ледзь пазнаў Валянціна.

У хлапчукоў мурзатых
Блішчэлі адно вачаняты.
— Як пазнаваць вас? — спыталі.
— Па голасе, — усе адказалі.

Дзіцячыя мары

Азваўся малы Колька;
— Хацеў бы быць багатым,
Каб зарабляць мог столькі,
Як зарабляе тата.

— Хацела б я таксама,
Кажа сястрыца Каця, —
Столькі, як наша мама,
Грошай штодзённа траціць.

Тамаш

Чамусьці многія з нас лічаць, што дзеці павінны дэкламаваць адно дзіцячыя вершы.

Тамаш Ляўчук падрыхтаваў верш Надзеі Артымовіч — „У Бельску”. У выкананні чацвёртакласніка верш бельскай паэткі прагучаў асабліва. Хлапчук насыціў яго цеплынёй і дзіцячай ласкавасцю. Адчувалася эмацыйная сувязь дэкламатара з творам.

Не дзіва — Томак вучань бельскай „тройкі”.

На цэнтральным аглядзе „Роднага слова” атрымаў вылучэнне.

Зорка

Дзень дзіцяці

Дзень дзіцяці — свята не толькі наймалодшых, але і старэйшых дзяцей, а таксама бацькоў, бо ўсе калісьці былі малымі, прыгожымі дзяцьмі. У гэты дзень няма падзелу на багатых, бедных, прыгожых, брыдкіх. Усе дзеці — роўныя. У школе ў Дубічах-Царкоўных адбыўся асаблівы Дзень дзіцяці. Да нас прыехалі новыя дзеці, якіх мы яшчэ не ведалі і зараз мелі нагоду пазнаёміцца. Святкаванне праходзіла над вадасховішчам Бахматы. На пачатку выступілі прадстаўнікі ўсіх асяродкаў. Потым пачаліся конкурсы. На прывітанне і распачацце ўрачыстасці мы прывіталіся з камендантам гранічнай стражы. Пасля пачаўся паказ дрэсіраваных паліцыйных сабак. Сабакі вельмі добра падрыхтаваныя да кожнай акцыі. Пасля пасыпаліся конкурсы і... цікавыя ўзнагароды. Кожны, нават той, хто не прымаў удзелу ў ніводным конкурсе, атрымаў ласункі. На Бахматах апрача конкурсаў мы мелі магчымасць пагуляць у футбол, пляжны валейбол, маглі пакатацца водным веласіпедам, хадзіць па вадзе, пяску і аблівацца вадой. Сонейка прыгравала і ўсе дзеці загаралі. Прыемна было паглядзець на румяныя тварыкі шчаслівых дзяцей.

Адкуль я вучылася ў ПШ у Дубічах-Царкоўных, не памятаю, каб так, як сёлета, мы правялі Свята дзіцяці. Найбольш шчаслівымі былі дзяўчаты, бо мелі магчымасць пагутарыць з пагранічнікамі, а таксама пазнаёміцца і *павар'яцець*.

Шкада, што 1 чэрвеня бывае толькі раз у год.

Ева Калбасюк, Войнаўка

Вёска Тарнопаль

Тарнопаль — невялічкая вёска ў Нараўчанскай гміне, між лясамі Белавежскай і Лядзкай пушчаў. Вёска заснавана праўдападобна ў 1921 годзе, хаця часамі можна пачуць, што яна была ўжо ў 1801 годзе.

Даўным-даўно жыў на гэтых землях багаты пан. У яго было многа ўраджайнай зямлі. Ён хацеў выехаць адгэтуль і пачаў прадаваць сваю маёмасць. Даведаўся аб гэтым нейкі чалавек і адкупіў ад багача крыху зямлі. Пасля пачалі прыязджаць сюды іншыя купцы. У такі спосаб паўставалі новыя маёнткі, якія атрымоўвалі назвы: Гайдукі, Палончыцы, Урочыска, Круглік. Іх назвы людзі тлумачаць па-рознаму. Урочыска — месца, дзе была „здаровая" зямля, якой лячылі людзей нават ад урокаў. Палончыцы — месца, дзе людзі часта палілі вогнішчы. Пасля нейкага часу людзі ўсе гэтыя месцы назвалі адной назвай — Тарнопаль. Чаму так? Невядома. Можа ад імя першага купца ці жыхара.

Да II сусветнай вайны ў вёсцы жыло 250 чалавек. У верасні 1941 года гітлераўцы загадалі жыхарам Тарнопаля на працягу дзевяці дзён разабраць усе будынкі ў вёсцы і выехаць. Частка людзей гэтага загаду не выканала. 14 верасня 1941 г. у вёсцы паявіліся нямецкія жандары, якія перасялілі людзей, іх дабро зрабавалі, а дамы, хлявы і гумны — спалілі.

У адбудаваным пасля вайны Тарнопалі жыло таксама 250 чалавек, а цяпер — толькі 118.

Інфармацыі сабрала
Іаанна Русакоў,
II кл. Гімназіі ў Нараўцы

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

„Рамонка" з Ласінкі

Дзяўчаты з калектыву „Рамонка" у час вялікіх святаў і нядзельных багаслужэнняў спяваюць у царкоўным хоры, якім кіруе дырыжор Марыя Радчук. Вывучаюць яны новы царкоўны рэпертуар і прымаюць удзел у міжнародных фестывалях царкоўнай музыкі. Атрымалі Гран-пры ў 2003 і першае месца на Міжнародным фестывалі праваслаўнай музыкі ў Мінску ў 1998 г. Перамагалі ў Міжнародным фестывалі праваслаўнай музыкі ў Магілёве. Часта выступаюць на аглядах праваслаўных калядак. Занялі першае месца на Агульнапольскім аглядзе калядуючых калектываў у Тарэспалі ў 2001 годзе. (ам-з)

Кася

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Кацярына Кузьміч з Гарадка доўга шукала адпаведны верш. Усе прапанаваныя настаўніцай творы не надта ёй падыходзілі. У канцы Кася рашылася на малавядомы ў нас верш Янкі Купалы — „Ворагам беларушчыны".

Калі ідзе пра рэпертуар дэкламатараў — рэдка яны вяртаюцца ў мінулае. Пераважаюць сучасныя аўтары. А трэба сказаць, што Купала і сёння гучыць актуальна. Праўда, у яго адраджэнскіх вершах сустрэнем небывалую эмацыйнасць і подых рамантызму.

Выступленне Касі ўзнагародзіла конкурсная камісія, яна прысвоіла гарадоцкай шасцікласніцы другое месца на цэнтральным аглядзе конкурсу „Роднае слова".

Зорка

Польска-беларуская крыжаванка № 27

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 23: Юка, букет, ганак, Ясь, ніва, цар, лак, яны, п'еса, якут, арол, кава. Банан, суніцы, кава, ял, лекар, пук, лета, космас, каса.

Узнагароды — **запісныя кніжкі** — выйгралі: **Дам'ян Мартынюк** з Новага Беразова, **Агнешка Ляўчук** з Новага Корніна і **Эмілія Саўчук** з Орлі. Віншуем!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Панарама з панадворка двара ў Шындзелі

Фота НАТАЛІІ КАНДРАЦЮК

Стаяць (злева): Марыля і Збігнеў Папельскія і аўтарка ў Шындзелі

Адкрываў на свет вочы

18 чэрвеня споўнілася сорак два гады з дня смерці Яна Тарасевіча. З гэтай нагоды Саколку наведалі кампазітар Збігнеў Папельскі з жонкай Марыляй.

Збігнеў Папельскі быў асабіста знаёмы з Янам Тарасевічам. Пазнаёміліся яны ў час вучобы ў музычнай школе сясцёр Франкевіч. Часта, разам з Ежы Максымюком наведваў кампазітара дома. Як прызнаецца беластоцкі музыкант, кантакт паўплываў на яго інтэлектуальнае і мастацкае развіццё. Першыя творы Збігнева Папельскага напісаны менавіта ў стылі Тарасевіча. Не быў яго вучнем, як і Ежы Максымюк. Вучыўся ігры на фартэпіяна ў Зофіі Франкевіч.

— Прафесар Тарасевіч быў вальнадумцам. Ён навучыў нас разумення талерантнасці. Гаварыў, каб не асуджаць кампазітара які піша ў іншай традыцыі, каб не ўспрымаць яго як свайго асабістага ворага. Бо калі ў яго іншы ад майго погляд — гэта не значыць, што ён горшы за мяне, — казаў.

Сваімі поглядамі, сваёй дзейнасцю, адносінамі да людзей адкрываў нас на іншыя перспектывы. Мы пачыналі бачыць іншы пункт гледжання. Узбагачаліся.

Збігнеў Папельскі працуе выкладчыкам імправізацыі ў Музычнай акадэміі ў Беластоку. Ён лаўрэат многіх узнагарод. Найбольш цэніць удзел у міжнародным конкурсе на камерны твор у Токіо, дзе заваяваў III месца. З'яўляецца членам Польскага саюза кампазітараў. У 2005 годзе будзе адзначаць сваё сямідзесяцігоддзе і пяцідзесяцігоддзе творчай працы.

* * *

Па дарозе ў Саколку ўспамінаем дзень паховін Яна Тарасевіча. Разам з іншымі вучнямі і сябрамі музыканта — Тэрэсай Казакевіч, Міраславам Кулікоўскім, Ежы Максымюком прыехаў у Саколку з Варшавы. Усе яны былі студэнтамі кансерваторыі.

— Прафесар Тарасевіч ляжаў сам у капліцы на могілках. Мы ўзялі ключ ад настаяцеля і адчынілі дзверы, а пасля адны сядзелі пры пакойніку. Адны вучні. На паховіны прыйшло яшчэ крыху людзей з Саколкі. Дзень, у які выпалі хаўтуры быў сонечны і цёплы, — прыгадвае. — Пачыналіся летнія канікулы.

Са Збігневам Папельскім я пазнаёмілася роўна сорак год пасля смерці Тарасевіча, 18 чэрвеня 2001 года. Наладзіць кантакт дапамагла спадарыня Валянціна Швед. Знаёмства па тэлефоне мы пачалі з гутаркі пра гадавіну.

— Сёння круглая гадавіна... — пачала я.

— Памятаю-памятаю, — пачулася з другога боку трубкі.

Пра музыканта часта гаварылі ў доме Папельскіх.

— Пан Тарасевіч вельмі любіў аладкі, — прыгадвае пані Марыля, — але мы не ведалі што гэта тыя „аладкі". Ці не экзатычная страва якая?

— A przecież to zwykłe placki ziemniaczane!

* * *

У Саколцы наведваем праваслаўныя могілкі. Магіла кампазітара прыбраная.

— Ёй апякуецца наша моладзь, — кажа сакольскі настаяцель Уладзімір Місіюк. Праз дзень, 19 чэрвеня на могільніку будзем маліцца за памерлых і асвячаць магілы, — дадае.

— Як і ў мінулым годзе, мы памаліліся за кампазітара і яго родных, — адзначае айцец Уладзімір. Гэтая традыцыя завялася ў 2001 годзе, калі тут урачыста адсвяткавалі саракавую гадавіну.

Запальваем намагільныя лямпачкі. Пасля едзем у Шындзель, ва ўрочышча, у якім жыў, працаваў і гаспадарыў музыкант. Месца захапляе прасторнасцю краявіду і сакавітай зеленню.

На жаль, нідзе ў наваколлі няма інфармацыйнай табліцы. Па маёнтку і двары не засталося следу і трапіць сюды можа толькі знаёмы з ніўскімі публікацыямі фанат, або дзякуючы роспытам у мясцовых старажылаў. У другім выпадку ёсць праблема, у радыусе кіламетра няма хутароў.

Імя музыканта звязалася з зямлёй і прыродай. Яго прозвішчам сяляне завуць лес і гару. Ёсць нават анекдот пра гару і Тарасевіча.

Анекдот узнік пад уплывам пэўнай гісторыі. Панадворкам двара ішла дарога з Жукоў у Саколку. Праходзіла ля самога дома і праз сад музыканта. Кампазітар не любіў, як ля яго акон ад світанку грукацелі вазы-жалезнякі. Ён падумаў павярнуць дарогу. Але новы шлях не надта спадабаўся мясцовым. Па простай прычыне — дарога ішла пад высокую гару. Аднойчы адзін з суседаў хацеў дакучыць кампазітару:

— Żeby panicz był koniem, Rogalski furmanem, a ja sabaka, to ja by podbiegł i tego konia za nogę... chap, chap!

Тарасевіч памаўчаў і пасля адказаў у сваім стылі:

— Я не конь, Рагальскі не фурман... А вы што — сабака?!

Анекдот на змешаных польска-беларуска-рускай мовах паўтараюць і сёння шындзельскія старажылы.

* * *

Вялікай падзеяй і крокам у адкрыванні сакольскага музыканта з'яўляецца нотнае выданне выбраных твораў на фартэпіяна — „Песні кахання". Ноты пад рэдакцыяй Ігара Алоўнікава пабачылі свет дзякуючы Беларускаму гістарычнаму таварыству. Спонсарамі гэтай беластоцкай-мінскай публікацыі сталі Управа горада Беласток і Беластоцкая еўрапейская ініцыятыва.

Шкада толькі, што ў самой Саколцы — ідзе мне пра дзеячаў культуры — усё не патрапяць адкрыцца на свайго славутага ўраджэнца. У час Дзён Саколкі найшумней адзначалі тут „Свята каня".

— Chlubą Ziemi Sokólskiej jest koń rasy sokólskiej, — стаіць у буклеце пра рэгіён. Дарэмна шукаць інфармацыі пра музыканта, які прысвяціў жыхарам Саколкі свае кампазіцыі.

Ганна Кандрацюк

Фэст у Гайнаўцы

VI Беларускі фэст „Крыначка 2003" традыцыйна арганізаваны быў у жыллёвым квартале „Мазуры" ў Гайнаўцы на трэці дзень Свята-Троіцкіх святкаванняў. У гэтым годзе фэст прыцягнуў многа людзей, у тым ліку жыхароў вёсак, якія пасля малітваў у лясной царкоўцы, заехалі да сваіх дзяцей пражываючых у Гайнаўцы.

Беларускае мерапрыемства адкрылі старшыня Галоўнага праўлення БГКТ Ян Сычэўскі, дырэктар Гайнаўскага дома культуры Андрэй Скепка і сакратар Павятовай управы БГКТ у Гайнаўцы Міхал Голуб, які ўжо шосты раз шукаў спонсараў і займаўся падрыхтоўкай пачастунку для выступаючых калектываў. Раней хадайнічаў ён ад імя Гайнаўскага аддзела БГКТ, а зараз мерапрыемства арганізавалі Галоўнае праўленне і Павятовая ўправа БГКТ. Суарганізатарам мерапрыемства традыцыйна быў ГДК.

— Хаця на трэці дзень Святой Тройцы галоўныя святкаванні адбываюцца ў Крыначцы і Дубінскім прыходзе, то амаль усе дарогі да іх вядуць праз Гайнаўку. Тут затрымліваюцца людзі пасля багаслужэнняў, — заявіў сакратар Міхал Голуб.

Памянялася толькі месца выступлення калектываў, бо сцэна пастаўлена была з другога боку вялікага магазіна, побач якога збіраліся людзі слухаць музыку. Вядучая Зося Лемеш патрапіла па-мастацку прадставіць выступаючыя калектывы. Першымі спявалі харысты Гайнаўскага дома культуры. Пасля ўдала выступілі вучні Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, Комплексу школ распалажанага па вуліцы Новаваршаўскай і калектыў „Знічка" з белліцэя. Вучні спявалі песні, якія апрацавалі апошнім часам з апекунамі Бажэнай Ляўчук з белліцэя і Евай Галашэвіч з гайнаўскай „шасцёркі". Вярталіся таксама да старэйшага рэпертуару. Пасля моладзі на сцэну выйшлі старэйшыя выканаўцы — калектывы „Крыніца" з Беластока, „Расспяваны Гарадок" і „Прымакі". Лявоніхай і польскімі танцамі зацікавілі гайнавян вучні з танцавальнага калектыву ГДК. Пасля перапынку да танцаў іграў вакальна-інструментальны калектыў таксама з ГДК.

— Уражанні ад выступленняў калектываў вельмі добрыя. Спадабаліся мне спевакі з Гарадка, аднак найлепш раскруцілі фэст „Прымакі". Людзі выстраіліся ў чаргу за іх касетамі. Я сама купіла дзве касеты. Беларускія песні настолькі падабаліся, што я нават нервавалася, калі нехта збоку гаварыў аб палітыцы, — заявіла жанчына, якая прыйшла на фэст са сваёй сям'ёй.

Мерапрыемства адбылося дзякуючы фінансавай падтрымцы бюджэтаў горада Гайнаўкі і Гайнаўскага павета. Арганізацыю фэсту ўспамаглі таксама гайнаўскія ўстановы: Гандлёва-вытворчы кааператыў працы (побач яго магазіна адбываўся фэст), Жыллёвы кааператыў і пякарня „Эмма" ды мясакамбінат „Рольмак плюс" з Макаўкі. У час перапынку прадстаўнікі гандлёвага прадпрыемства AVON арганізавалі для публікі конкурсы з узнагародамі.

Аляксей Мароз

Сардэчная справа

— Выпішам яго праз тры дні, — паведаміла лекарка сястру ляжачага на рэанімацыі саракагадовага Яўстаха Л. — Яны ўсе п'юць.

— Ды ж гэта гаспадар на дваццаці гектарах, гадуе кароў... Не выпаў сароцы з-пад хваста... І не п'яніца...

Яўстах Л. адчуваў быў сябе вельмі кеспка пару тыдняў. Балела ў грудзях, адчуваў сябе блага, суха кашляў, хоць не быў прастуджаны. Ледзь спраўляўся ўправіцца з гаспадаркай. Добра, што за падмогу быў ягоны малодшы брат Ёзік. Ён і пазваніў па скорую дапамогу. Вяскоўцы баяцца званіць па карэтку — большасць з іх не мае аплачанай страхоўкі, і прыезд скорай ды магчымая пабыўка ў бальніцы гэта страшны выдатак. Яўстах і Ёзік спраўляліся з усімі аплатамі, ды пасля таго як аплацілі падаткі ды страхоўкі, не заставалася ў іх амаль нічога. Нарабілі былі даўгоў, і пагражала ім тое, што і суседзям у падпушчанскай вёсцы, вельмі атракцыйнай для турыстаў — адняцце за даўгі хаты ці нават цэлай гаспадаркі. Было даўгу каля чатырох тысяч — КРУС пагадзіўся, каб сплачвалі яго без адсотак на працягу пару гадоў. Ёзік спакойна выклікаў скорую, і, аказалася, у апошнюю хвіліну — ягонага брата ледзь адратавалі. Сэрцу не хапала кісларода, а правы жалудачак быў залішне вялікі. Гэты парок сэрца развіваўся ўжо пару гадоў, Яўстах адчуваў гэта, ды, сапраўды, з-за нагляду за гаспадаркай ды адлегласці да лекара, не меў часу хварэць ды вазіцца з хворым сэрцам. Папраўдзе, і не вельмі даядаў — усё, што мог прадаць, прадаваў. Жылі хлопцы-гаспадары найчасцей на бульбе ды гародніне. На супіках, добрых для худзеючых, а не для волатаў-рабацеяў. Здаровых мужыкоў. Здаровых — мажных, на выгляд самавітых. Ды якое там здароўе...

Падключылі Яўстаха да апаратуры на цэлыя суткі. Ноччу прастыў.

— Паслязаўтра будзем яго выпісваць. На гэты парок дык лячыцца трэба дома. Ціск высокі, таблеткі трэба на паніжэнне, — тлумачыла Яўстахавай маці доктарка. — Мы вызвалі вас сюды, каб падпісалі згоду на адну працэдуру. Небяспечная. Каб выраўнаць пульс, ну, і ўвогуле біццё сэрца, мы павінны адключыць яго ў вашага сына на нейкі час. Хвілін пяць. І зноў увесці ў рух, электрычна. Нічога больш не можам зрабіць.

— А хоць Стах прачнецца? Колькі раз рабілі вы такое ў павятовым шпіталі? — маці Яўстаха падпісала згоду дрыжачай далонню. — І адразу ж на другі дзень — дадому?

— Але. З такой хваробай можа пачаць хадайнічаць за пенсію ў КРУСе. Бачу, што ўсё аплачана. Мае шчасце, бо за кожны дзень пабыўкі ў нас плаціў бы 30 злотых. А так КРУС усё аплачвае.

Відаць, КРУСу гэта немалы клопат — плаціць за сваіх членаў. Таму і лепш, каб хутка вылечвалі іх ды высылалі з бальніцы дахаты.

Яўстах пасля аперацыі спахапіўся без клопату. І, як нейкі казачны багатыр, пасля чарадзейнай смерці-сну, стаў прасіць есці. Толькі выпісвай. А ён паеў, ды ўстаць не можа. Зрабілі рэнтген — а ў яго абое лёгкія занятыя. Двухсторонняе запаленне. Дзе ж такога выпішаш. Перакінулі хворага на другое аддзяленне. Ляжаў Яўстах Л. яшчэ тры тыдні ў бальніцы.

Дахаты паехаў на аўтобусе ў марозны снежаньскі дзень. Каб выпісалі яму наступнае звальненне, мусіў выбрацца да гміннага лекара. Каб купіць неабходныя лякарствы, чакаў выплаты з КРУСу сваіх бальнічных. А яны прыслалі паперку — „бальнічныя — нуль". Бо на ім ляжыць яшчэ той доўг, які сумленна штомесяц сплачвае, і якога засталося яму да канца года. Дык з бальнічных і аплацілі наперад. Дык будзе менш яму яго плаціць, але ў канцоўцы. Праўда, звычайна гэтага не робяць, але гэта рашэнне начальства. Бо выплачвалі такім, а даўжнікі бралі ды паміралі, не пагасіўшы даўгу. Вось, бачыце: Яўстаху Л. зноў прадоўжылі бальнічныя. Нічога рабіць яму нельга. А колькі ён пажыве, хто яго ведае. Вопыт паказвае, што мужчыны ў яго ўзросце мруць у вёсцы як мухі. Вопыт гэты — установы КРУС, дарэчы, кожны гэта бачыць. А за што купіць Яўстах Л. лякарствы, каб устаць на ногі? А што з гаспадаркай? Добра, што яшчэ брата мае, дык хоць той управіцца, кароў падоіць, малако здасць, свіней накорміць...

Кажуць, КРУС мае спалучыцца з ЗУСам. **Зус**ім тады хоць лажыся!..

Лукаш Правасуд

Ажурная вёска

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Крыж у цэнтры Зачарлян; побач, з правага боку — памятная стэла чырвонаармейцу

Паны б'юцца, а ў мужыкоў чубы трашчаць — так можна сказаць пра гісторыю Зачарлян у мінулым стагоддзі. Сёння гэтая вёска, што ў Харашчанскай гміне, вядомая ў наваколлі Беластока галоўным чынам асяродкам самааздараўлення наркаманаў, які размясціўся ў будынку тамашняй колішняй школы. Сама вёска надта ажурная — асталося ў ёй мо з дзесяць хат.

Побач згаданага асяродка стаіць праваслаўны крыж з добра захаванымі ахвяравальнымі адрасамі. Галоўнай справай, якая падштурхнула ўстанаўленне крыжа, была чыгуначная катастрофа ў 1888 годзе на лініі Курск — Харкаў, дзе поезд з расійскім царом зваліўся з насыпу. У яе выніку памерла шмат людзей, але галоўны пасажыр, хаця патурбаваны, астаўся ў жывых. Ну і „благодарные верноподданные" радасна паставілі крыж, пры нагодзе згадваючы і пра сваё здароўе.

У 1915 годзе праваслаўныя жыхары Зачарлян, у якіх пражывала ў той час адно дзве каталіцкія сям'і, былі прымушаны эвакуіравацца ў Расію, а казакі наступнага расійскага цара спалілі вёску; мабыць „въ назидание потомству". Вяртанне з бежанства ў пустую вёску было ўцёкамі з агню ў полымя. Галеча вярнуўшыхся праваслаўных, у параўнанні з не так жорстка дасведчанымі ваенным лёсам суседзямі, выклікала горыч і бунт. А бунтавацца можна было не супраць прычыняльнікаў гаротных абставін — ранейшых уладароў, бо іх ужо не было, але супраць тых, што прыйшлі на іх месца. А гэта спараджала і канфлікты з суседзямі, якія ў другую сусветную вайну, як гэта ў ваенны час бывае, перарадзіліся ў такія, якія нельга назваць мірнымі. Пасля вайны большасць жыхароў Зачарлян раз'ехалася па свеце; вёску пакінулі ўсе праваслаўныя.

Апрача згаданага крыжа стаіць у Зачарлянах і іншы — падобны — праваслаўны крыж, але без захаваных надпісаў. Побач яго стаіць малая стэла, на якой надпіс пад пяціканцовай зоркай у такім стане, што ў сонечнае надвор'е нечытабельны, але ўдалося мне яго, быццам невідушчаму, намацаць. Вось яго змест: „Лейтенант Справцев Митрофан Семенович, 1913 г. р. Награждёный медалью за боевые заслуги. Умер при выполнении служебных обязанностей". Калі лейтэнант загінуў — невядома. Ды і іншыя зачарлянскія тайны развеяліся па свеце следам за большасцю аўтахтонаў.

Аляксандр Вярбіцкі

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

У Чаромхаўскім прыходзе

22 чэрвеня ў чаромхаўскай царкве Іконы Божае Маці „Дастойна ёсць" або „Замілаваная" прайшло святочнае богаслужэнне ў гонар заступніцы. Хоць надвор'е не паспрыяла (ішоў дождж і цягнула холадам), але вернікі многалюдна прыйшлі ў храм. Чарамшанам гэта была нагода для сямейных сустрэч і арганізавання застолля, а гандлярам — нядрэнны прыбытак.

Чаромхаўскі прыход арганізаваўся ў 1986 годзе, калі не было яшчэ царквы. Краевугольны камень быў пакладзены 11 кастрычніка 1987 г. Восем гадоў будавалася царква ў грамадскім пачыне. 11 кастрычніка 1995 года ў дзень закладкі краевугольнага каменя мітрапаліт Васілій высвяціў царкву. Зараз штогод у дзень заступніцы і закладкі царквы праходзяць царкоўныя фэсты. Ад 1988 года настаяцелем тут айцец Георгій Пліс. З таго часу змяніўся выгляд храма ўнутры, як і звонку. Збудавана шыкарную агароджу. Гэта ў асноўным заслуга прыхаджан і настаяцеля.

Уладзімір Сідарук

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Новы пешы шлях

На тэрыторыі Нараўчанскай, Міхалоўскай і Гарадоцкай гмін адкрылі новы шлях турыстам-пешаходам „Нараўка — Валілы" (зялёны). Вядзе ён з Нараўкі цераз Бандары (побач Семяноўскага вадасховішча), Юшкаў Груд, Ціванюкі, Старыя Кухмы, Ляўшы, Новую Волю, Казімярова і Міхалова. З Міхалова цераз Пянькі ў Гарадок і адтуль рукой падаць у Валілы.

Гэты шлях спалучае Белавежскую пушчу з Кнышынскай. На ім знаходзяцца, між іншым, прыгожыя цэрквы ў Нараўцы, Юшкавым Грудзе, Новай Волі, Міхалове і Гарадку.

Вышэйзгаданы пешы шлях можна падзяліць на этапы і ісці па ім на працягу пару дзён. Ёсць дзе пераначаваць. Турыстаў чакаюць начлежныя месцы ва ўтульных прыватных дамах у Нараўцы, Плянце, Бандарах, Старых Кухмах, Кабылянцы, Міхалове, Пяньках, Гарадку і Валілах. У Валілах, апрача кватэр для начлегаў, турыстаў чакае гасцініца „Пронар" і заязны дом „Губэртус".

(яц)

Жыццё абарванае ў палове

Трымаю ў руках прыгожа афармленае запрашэнне і чытаю: „Войт гміны Орля, дырэкцыя, настаўнікі, вучні і бацькі Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Орлі маюць гонар запрасіць Віктара Шведа на ўрачыстасць прысваення імя Комплексу школ дня 23 мая 2003 года".

Пазваніў мне войт Арлянскай гміны Ян Добаш і сказаў: „Сёння буду з дырэктаркай школы Яўгеніяй Васілюк у Кураторыі ў Беластоку. Прыйдзі, уручым табе запрашэнне на наша мерапрыемства". Мы сустрэліся, атрымаў я запрашэнне з рук дырэктаркі. Войт, прыемна ўсміхаючыся сказаў: „Ты — адзіны запрошаны на мерапрыемства «белавежац», які вучыўся ў нашай школе". Напісаў я верш „Арлянская школа", з якім меўся выступіць на ўрачыстасці.

На жаль, мерапрыемства не адбылося, нечакана адышоў у вечнасць войт гміны Орля Ян Добаш, які меўся ўручыць акт прысваення імя мясцовай школе.

Я безупынна маю перад вачыма мажную постаць майго сардэчнага друга, суседа з вёскі Крывятычы, што мяжуе з маёй вёскай Мора.

Ян Добаш заўсёды мяне прасіў: „Едучы ў сваё Мора не абмінай па дарозе Орлі". І мы сустракаліся даволі часта. Цяжка паверыць, што не сустрэнемся больш ніколі, што абарвалася ў палове маладое яшчэ жыццё гэтага, заўсёды з усмешкай на твары, чалавека.

Ян Добаш нарадзіўся 26 красавіка 1956 года ў вёсцы Крывятычы. Вучыўся ён у новапабудаванай паміж нашымі суседнімі вёскамі тысячагодцы. У 1975 годзе закончыў Агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання імя Браніслава Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім, а потым Кафедру беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта. Свой працоўны шлях распачаў у гміннай Падставовай школе

ў Чыжах, дзе быў настаўнікам беларускай і рускай моў. Потым працаваў дырэктарам Падставовай школы ў Пашкоўшчыне, распаложанай у чыстым полі, аж да яе ліквідацыі з-за малой колькасці вучняў. Да гэтай школы адношуся з асаблівым пачуццём. 3 снежня 1968 года падпісаў я ў ёй вучням пасля аўтарскай сустрэчы рэкордную колькасць — 250 экземпляраў — свайго першага паэтычнага зборніка „Жыццёвыя сцежкі", дзякуючы настаўніцы польскай мовы пані Заянчкоўскай.

Нябожчык Ян Добаш быў не толькі добрым настаўнікам, але і дасканалым арганізатарам, дырэктарам школы. Шмат часу прысвячаў ён таксама грамадскай працы. Быў ён актыўным членам Галоўнага праўлення і Праўлення Бельскага аддзела БГКТ. Супольна з настаўнікам Юрым Жменькам заснавалі ў школе ў Пашкоўшчыне дасканалы дзіцячы інструментальна-харавы мастацкі калектыў, які выступаў у беларускім асяроддзі. Помніцца мне таксама арганізаваны Янам Добашам фэст БГКТ у Пашкоўшчыне, у якім апрача насельніцтва навакольных вёсак прысутнічалі госці з Гродна — беларускія пісьменнікі — выхадзец з Беласточчыны Аляксей Карпюк, Данута Бічэль-Загнетава і Юрка Голуб. Пасля ліквідацыі школы ў Пашкоўшчыне Ян Добаш не атрымаўшы працы ў беларускім асяроддзі, быў дырэктарам невялікай Падставовай школкі ў Шмурлах. Адрамантаваў ён гэтую школу і ўстанавіў добрае супрацоўніцтва з мясцовым насельніцтвам, якое, ведаючы што ён беларус, поўнасцю яго адабрала. Цесна супрацоўнічаў ён таксама з дырэктарам сельскагаспадарчай школы ў Рудцы Ежы Снарскім (цяпер старастам Бельскага павета). Дзякуючы гэтаму супрацоўніцтву Ян Добаш прыступіў да арганізацыі ў Рудцы гімназіі і стаў яе дырэктарам.

Радныя гміны Орля на сваёй самаўрадавай сесіі 28 снежня 1999 года выбралі Яна Добаша войтам Арлянскай гміны. Восенню 2002 года ў другім туры гмінных самаўрадавых выбараў Ян Добаш паўторна стаў войтам Арлянскай гміны і плённа працаваў да 2 мая г.г., калі занядужаў падчас выконвання службовых абавязкаў. Пасля месячнай барацьбы за жыццё ў беластоцкім шпіталі памёр ён у суботу, 7 чэрвеня г.г., пакінуўшы назаўсёды ў несуцешным смутку сваю маці Ліду, жонку Кацярыну, адзінага сына Адама, родных братоў Пятра і Уладзіміра з сем'ямі, шматлікіх сяброў і насельніцтва гміны Орля.

„Заўсёды будзем адчуваць недахоп гэтага чалавека. Быў ён знаходлівым гаспадаром гміны, надзвычайным начальнікам, дасканалым сябрам. Астанецца ён назаўсёды ў памяці жыхароў гміны. Такога войта Орля яшчэ не мела і хіба доўга не будзе мець", — сказала Ірэна Адзіевіч — сакратар Арлянскай гміны.

Пахаванне нябожчыка адбылося 11 чэрвеня г.г. Паніхіду ў царкве святога Міхаіла ў Бельску-Падляшскім адслужыла восем праваслаўных святароў. Прысутнічаў таксама каталіцкі ксёндз. Развітацца з пакойнікам прыбылі прадстаўнікі консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку, падляшскіх ваяводскіх улад, Бельскага і Гайнаўскага старостваў, войты гмін з усходняга Падляшша, настаўнікі і вучні бельскіх школ, шматлікія жыхары Арлянскай гміны, многія сябры і знаёмыя.

Над магілай пакойніка з развітальнымі прамовамі выступілі Ян Сычэўскі ад імя Галоўнага праўлення БГКТ і войт Браньскай гміны Кшыштаф Яваройскі ад імя ўсіх прысутных на пахаванні войтаў. Магіла Яна Добаша на праваслаўных могілках па вуліцы Дубяжынскай у Бельску-Падляшскім патанула ў шматлікіх вянках і букетах кветак.

Няхай табе, дарагі дружа, родная зямелька будзе пухам! Няхай цябе Усявышні Бог мае ў сваёй апецы!

Развітанне

Дружа сардэчны мой, Янка,
Жывых пакідаеш зарана.
Смерць лютая быццам маланка
Скасіла цябе нечакана.

Ты доўга змагаўся са смерцю,
Яна абяссіліла цела,
Наканаваў лёс памерці,
Заўчасна пакінуць свет белы.

Пасля ўсіх турбот ты ўжо дома,
А мы на Зямлі яшчэ госці,
І толькі той час невядомы,
Калі нам спачыць на пагосце.

Спакойна спі ў роднай зямліцы
Пад Боскай апекаю сталай
Няхай табе вечнае сніцца
Па нашым зямным нетрывалым.

Віктар Швед

Не адным півам жылося

Успамінае Аляксей ГАПАНЮК, 82-гадовы жыхар Пагрэбаў, што ў Кляшчэлеўскай гміне.

У Нямеччыну забралі мяне ў 1942 годзе. Выязджаў пасля Провадаў. У канцы красавіка, ці ў пачатку мая было гэта. На зборны пункт у Бельск-Падляшскі спадарожнічаў я на цягніку. Кампанію састаўляў аднавясковец Сямён Пілічук. Сем гадоў старэйшым за мяне лічыўся. З Бельска ў Моранг нас перавезлі. Летам працаваў я ў маёнтку пана Тэшкі. Мясцовасць не запамяталася (знаходзілася яна ў дваццаці кіламетрах ад Моранга). Жылі на хутары. Гаспадар быў багатым — меў два дамы, стадолу і кароўнік, у якім сорак штук жывёлы стаяла. Апрача таго дзевяць коней і свіней трымалі. Адзін дом пуставаў. Стадола драўляная была. Апошнія будынкі мураваны. Пан Тэшко добразычлівым і спагадлівым чалавекам аказаўся. Супрацьлеглы характар у гаспадыні быў. Да службы абы за што чаплялася. У маёнтку чатырох французскіх палонных працавала. Кватараваліся мы на паддашшы. Маё памяшканне знаходзілася на другім паверсе. Французскія палонныя даглядалі жывёлу. Кароў даілі. Я гаспадаркай займаўся. Працавалі мы ад світанку да змроку. Паколькі на начлег наракаць не было прычыны, дык харчаванне было кепскае. На снеданне кава з хлебам і кусочак маргарыну, на абед — суп з варанай бручкай ды бульбай, кусочак мяса або каўбасы. На вячэру зноў суп. Нядзеля была вольным ад працы днём. Ішоў я тады ў вёску да сябра Мікалая Каляды, які з Залешанаў выходзіў. Дрэнна яму паводзілася, злым чалавекам быў яго гаспадар. Мікалаю кватэру ў канюшні прыспасобіў. За працу пан Тэшко па дваццаць марак у дзень плаціў. Паколькі прадукты па талонах прадавалі, дык апрача піва нічога не можна было купіць. Але не адным півам чалавек жыве. Часта голад цярпець прыходзілася. Грошы, якія заставаліся, дамоў пасылаў. З надыходам зімы ў шахты на работу забралі. Восемсот метраў пад зямлёю працаваў. Чатыры дні як грузчык, затым у рамонтную брыгаду вузкакалейкі прызначылі. У брыгадзе грузчыкаў працавала чатырох палякаў і столькі ж немцаў. Цягнік на семдзесят-восемдзесят вагончыкаў забіраў (раней вугаль коньмі вывозілі). Кватараваліся мы ў драўляных бараках па некалькі дзесятак чалавек у адным. Спалі на аднаярусных ложках на матрацах. Прыкрываліся двума пледамі. Дрэнна нас кармілі. Плацілі па пяцьдзесят марак у дзень. У шахце разам працавалі Кузьма з Чаромхі-Вёскі (з 1939 года як палонны на работу трапіў) і Міхал Пагрэба з Пяшчаткі. У суседняй шахце Санька з Дашоў працаваў цесляром. Адукаваны чалавек. У гэтай кампаніі праводзілі мы вольны час. Баракі ацяпляліся вуглем. На шахце працаваў я два з палавінай гадоў. Асвабадзілі нас амерыканцы вясною 1945 года. З надыходам фронту, пад аховай, загналі нас у лес. Вартаўнікі паўцякалі. Каля двух месяцаў блукаліся па наваколлі. Мы ўдзевяцярых не падаліся на зборны пункт. Такім спосабам не былі прызваны ў армію. На цягніку дабраўся я ў Варшаву, затым у Беласток. Выпадкова ў горадзе сустрэў Сцяпана з Дубяжына (ягоная жонка з Сабятына выходзіла). Дамоў дабіраліся мы пехатою. Днём і ноччу ішлі. Калі дабраліся ў Дубяжын, дык сям'я калегі накарміла мяне. Пасля я ў напрамку Малочкаў падаўся. З Жукоў быццам на крыллях ляцеў дахаты. Некалькі дзён адпачываў пасля падарожжа. Затым з сярпом на поле падаўся, бо якраз было жніво.

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Запісаў Уладзімір Сідарук

Анісім

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Меў двух братоў і сястру. Бацькі абраблялі добрую гаспадарку і вельмі хацелі, каб адзін з сыноў застаўся на гаспадарцы. Анісімавы браты ды сястра пайшлі далей вучыцца і пасля вучобы засталіся ў горадзе. Там абсталяваліся, маюць свае сем'і і кватэры. Адным жывецца лепш, другім горш. Калі настала рыначная гаспадарка некаторым давялося жыць з г.зв. „куранёўкі", былі беспрацоўнымі.

Анісім ад малога цікавіўся сельскай гаспадаркай і бацькі былі задаволены, што хоць ён застанецца на вёсцы і будзе пры кім спакойна дажываць старасці. Пазнаёміўся Анісім з Наталляй, дзяўчынай з суседняй вёскі, якая была адзінай у бацькоў і мелі таксама добрую гаспадарку. Пасля трох гадоў знаёмства Анісім рашуча заявіў бацькам, што пойдзе ў прымы да Наталькі. Бацькі прасілі, плакалі, каб не пакідаў сваю добрую гаспадарку. Гаварылі: „Бяры Натальку да сябе, а мы, колькі зможам, будзем дапамагаць вам у гаспадарцы". Нічога не памагло. Пайшоў Анісім у прымы. Жылі ў сям'і згодна ўсе. У хуткім часе пахаваў Анісім свайго цесця, а праз два гады — цешчу. Дзеткі іхнія падраслі, некаторыя ўжо на сваім хлебе ў горадзе, малодшыя яшчэ вучацца.

Калі Анісімавы бацькі дажылі пенсійнага ўзросту паклікалі сваіх дарослых дзетак на сямейную нараду, каб вырашыць, што зрабіць з гаспадаркай. Гарадскія дзеткі адмовіліся ад бацькаўшчыны, а Анісім згадзіўся, каб перапісалі на яго гаспадарку. Усе былі задаволены, што Анісім згадзіўся, маўляў, будзе куды прыехаць з горада; абяцалі, што будуць дапамагаць. І так яны згодна жывуць па сённяшні дзень.

Найгорш стала Анісіму, калі пачалі прыязджаць сюды псеўдатурысты з-за ўсходняй мяжы ды прывозіць танныя спіртныя напоі. Сталі яны заязджаць да Анісіма, і стаў ён з імі часта выпіваць, калі ў яго начавалі. Застаўлялі нават свой „тавар", які потым Наталька прадавала па вышэйшай цане. Быў нават нядрэнны прыбытак да гаспадаркі, але Анісім штораз часцей выпіваў.

Два гады таму, зімою, надумаўся Анісім праведаць сваіх бацькоў ды дапамагчы ім у хаце. Прыйшоў у родную хату, але не было тут што рабіць. Бацькі ўгасцілі сына, пачаставалі вінаградным віном хатняй работы, выпілі, пагутарылі. Дзень быў халодны, 12 градусаў марозу. Перад поўднем Анісім развітаўся і выбраўся дамоў. Па дарозе, аднак, як пасля выявілася, сустрэў сяброў і пачалі яны выпіваць рускі спірт.

Вечарам дзедку патэлефанаваў Анісімаў сын з запытаннем ці ёсць у іх ягоны бацька, але дзедка адказаў, што пайшоў дамоў перад поўднем. Устрывожыліся жонка Наталля і дзеці ды дзед з бабай, што Анісім дзесьці прапаў, а на дварэ мароз ужо пад 20 градусаў. Праз нейкі час звоніць на тэлефоне дзед і пытае ўнука, ці вярнуўся бацька нанач, але пачуў адказ, што няма. І яшчэ больш устрывожылася Анісімава сям'я. Але куды ж пойдзеш шукаць? Яму адна дарога, а табе — дзесяць.

Леглі спаць дзед з бабай, але ім не спіцца. Не гавораць адно з адным, бабка моліцца, просіць Бога, каб вярнуў сына дамоў. Жонка Наталля таксама не спіць, знерваваная чакае мужа, а мароз аж трашчыць за акном. Познім вечарам пачуў дзед брэх сабак, а потым стукат на панадворку. Схапіўся з пасцелі, глянуў у акно і бачыць, што Анісім стаіць ля дзвярэй. Выбег хутчэй у кальсонах, адчыніў дзверы і пачаў сварыцца з сынам, выбегла таксама маці і давай заганяць абодвух дахаты. Калі Анісім увайшоў у хату, дрыжаў цэлы быццам асіна ў лесе. Маці хутчэй кінулася слаць пасцель сыну, а дзед патэлефанаваў нявестцы, што Анісім з'явіўся, каб не трывожылася і спакойна адпачывала.

Раніцай прачнуўся Анісім і стаў разглядацца, дзе ён знаходзіцца. А калі апамятаўся, хутка апрануўся ды пайшоў да жонкі і дзяцей, каб людзі не бачылі. Было яшчэ цемнавата. Вось да чаго даводзіць выпіўка, калі хто не ведае меркі ды не мае цвёрдай волі! Страх падумаць, што магла б здарыцца трагедыя! Гэта ж была зіма, мароз! Тут, відаць, Анісім меў крыху шчасця. Гасподзь выслухаў малітваў старэнькай маці і ўказаў дарогу Анісіму ў сваю родную хату. Абмінайце гарэліцу, хто як можа, людцы дарагія!

Мікалай Лук'янюк

Што будзе з ваўкамі

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Усё, чым захапляемся ў сабак, выводзіцца ад ваўкоў. Стагоддзямі праследаваныя, былі ў большасці вынішчаны і сапхнуты ў найбольш дзікія закавулкі Еўропы. Але выжылі! У Польшчы ваўкі з 1988 года апынуліся пад аховай. Мяркуецца, што ў краіне пражывае іх 600-800 штук, галоўным чынам у паўднёвай, усходняй і паўночна-ўсходняй яе частках.

Ваўкі жывуць да 16 гадоў, водзяцца ў сямейных групах лікам 2-11 штук. Палююць на тую самую звярыну, што і паляўнічыя. Найчасцей трымаюцца здалёк ад людзей, але пры нястачы адпаведнай натуральнай тэрыторыі рызыкуюць наведванне паселішчаў.

На ваўкоў, а дакладней — на ўбыванне лясной звярыны з іх прычыны (раней пра гэту праблему пісала „Ніва"), наракалі паляўнічыя з гуртка „Цецярук" у Кляшчэлях. Водзяцца яны там у старым лесе каля Елянкі і каля Дабрывады. Не было там чуваць пра шкоды хатняй жывёле, бо — бадай — ваўкі не нападаюць там, дзе размешчаны іх логавы. Але шкоды здараліся ў суседняй Арлянскай гміне ў Паўлінаве, Вульцы-Выгаоўскай і Рыгораўцах. Вялікія страты ад ваўкоў — звыш дваццаці задушаных і параненых штук быдла — пацярпелі ў гэтым годзе жыхары гміны Збуйна за Ломжай.

Хатнюю жывёлу ваўкі атакуюць наогул тады, калі спадарожнічаюць ім маладыя, якія вучацца паляваць. Найбольшая пагроза павісае тады над маладняком.

Паводле спецыялістаў для адпуджвання ваўкоў ад людскіх паселішчаў дастаткова напалохаць іх выстраламі — няма патрэбы адразу забіваць.

Міхал Мінцэвіч

Калі будзе газ?

Ці доўга яшчэ будуць чакаць газу з трубаў гайнавяне і жыхары вёсак Гайнаўшчыны можа аказацца ў бліжэйшым часе. Паводле апрацаванага праекта давядзенне трубаправоднага газу з Вышак да паасобных мясцовасцей Гайнаўшчыны будзе каштаваць 54 мільёны долараў. Калі б раней газ даведзены быў да Бельска-Падляшскага, кошты газіфікацыі Гайнаўшчыны панізіліся б. Прадстаўнікі ўлад Гайнаўшчыны ў справе газіфікацыі вядуць размовы з Фондам ISPA, які разважае магчымасць фінансавання 80% інвестыцыі. Прадпрыемства горнай прамысловасці, керасіну і газу выдатковала б астатнія 20% коштаў на будову газавай сеткі і падключэння да яе паасобных дамоў. (ам-з)

Белавежа

Парк на выставе

Белавежскі нацыянальны парк запрашае на пластычную выстаўку п.з. „Нацыянальны парк скарбам нашай малой Айчыны". Экспазіцыя працуе ў Прыродазнаўча-лясным музеі ў Белавежы ў Палацовым парку, кожны дзень у гадзінах 9-16[30].

Гайнаўка

Кліканне пушчы

У галерэі „Гайно" Беларускага музея ў Гайнаўцы па вуліцы 3 Мая 42, працуе выстава рысункаў вядомага гайнаўскага мастака-артыста Віктара Кабаца і разьбы па дрэве мясцовага настаўніка-пенсіянера Уладзіміра Муські.

Выставу можна глядзець у гадзінах працы Музея. Запрашаем усіх зацікаўленых. (яц)

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Буслы шчасце прыносяць

Хто ж не любіць кветак? Гаспадыні апярэджваюцца ў задумах, як арганізаваць агародчык. Не модныя ўжо клумбы з каляровымі астрамі, цюльпанамі, нарцысамі ці вяргінямі. Іх месца занялі прыхатнія альпінарыі, фантаны ды штучныя звяры і птушкі. Цікавую кампазіцыю прыкмеціў я на сядзібе Валянціны і Васіля Панасюкоў у Кузаве. Сярод фруктовых дрэўцаў — клумба з рознакаляровымі кветкамі. Побач канава з вадою, у якую бусел прыглядаецца. Бусліная пара вышэй на гняздзе прыселася. Кажуць, што буслы шчасце прыносяць. Мабыць, гэта праўда. Гаспадарам нядрэнна жывецца. Нажылі прыгожы дом, адукавалі дзяцей, карыстаюцца аўтамабілем. І асноўнае — не страцілі працы на чыгунцы. Гаспадыня кандуктаркай працуе, а яе муж — машыністам. Пажадайма затым, каб сям'ю Панасюкоў і ў далейшым шчасце не пакідала.

Уладзімір Сідарук

аб'явы: *паслугі*

Samochodem osobowym wyjazdy promocyjne w teren i do Grodna.
Tel. 675 48 87

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2003 r. upływa 5 września 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Фота МІХАЛА КОСЦЯ, 2002 г.

Фэстываль Музыкі Маладой Беларусі

Басовішча 2003

18-19 ліпеня 2003 г., Гарадок, Беласточчына

18/19 ліпеня (пятніца/субота)

16^{30} — адкрыцьцё Фэстывалю
16^{45} — пачатак конкурснай часткі
21^{30} — канцэрт узнагароджанага гурту мінулагодняга выпуску — „Дзея"
22^{10} — „Зьніч"
22^{50} — „Rima"
24^{00} — „Зэт"
1^{10} — „Cool Kids of Death"

19/20 ліпеня (субота/нядзеля)

16^{00} — аб'яўленьне вынікаў конкурсу — канцэрт пераможцаў
17^{15} — „BN"
18^{00} — „Partyzone"
19^{00} — „Крама"
20^{10} — „Кальян"
21^{20} — „Deviation"
22^{30} — „Neuro Dubel"
23^{40} — „Zero-85"
0^{50} — „Уліс"
2^{00} — „H.P.M."

Арганізатар — Беларускае Аб'яднаньне Студэнтаў — пакідае за сабою права ўносіць зьмены ў гэтую праграму.

Адгаданка

					1	2
3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — прыказку.

1. марка беларускіх грузавікоў з Жодзіна =
9 __ 10 __ 5 __ 4 __ 11 __;
2. выраз твару або хаваемы снарад з выбуховым рэчывам =
3 __ 6 __ 1 __ 13 __;
3. грашовы подкуп для атрымання нейкай выгады =
7 __ 8 __ 14 __ 16 __ 15 __;
4. рэчыва, выклікаючае атручэнне =
2 __ 12 __;

Ш

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 20 нумара

Вялікаму каню вялікі хамут.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Васілю Бялькевічу** з Чыжоў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Радыкальная дыета

Рашылі мы з хлопцамі сесці на дыету. Разам з кабетамі. Мая, праўда, за акіянам, але жонкі Збышкі ды Міколкі якраз селі на тую шведскую дыету, двухтыднёвую. Пасля двух тыдняў можна скінуць свайго сала на кілаграмаў 7-20. Ну, тых сем-восем прыдалося б і мне пазбыцца, бо, бачу, завязаўся жывоцік. Фаршу ў расхрыстаных пінжаках, але ўжо з джынсамі, вось, праблема. Зашпільвацца прыходзіцца пад жыватом, а не на пупку. І раз купіў штаны на „цюхах", бо навінуліся — танныя ды шырэйшыя ў поясе. Модныя. Ну, што не купіць, калі ў шафе поўна прыцеснага адзення! А Коля дык ужо зрабіўся як карусель у абхваце — таму то і пара брацца за кравецкі метр! Збышку шмат не трэба скідаць цела, але ў апошні час перажывае другую маладосць, кажа, дык і яму тое пойдзе ў карысць.

Есці не так і мала — абы прызапасіцца ў шпінат, брокулы, салату, памідоры, лімон, аліву, яйкі, рыбку, худую ялавічыну. І, важнае, прынамсі ў 14 двухлітровых бутэлек з мінеральнай вадой. Тую ваду будзеш хлябтаць увесь дзень, а асабліва паміж снеданнем (кубак кавы з костачкай цукру), ланчам у поўдзень і абедам-вячэрай у 16, а пасля да самое ночы. Ноччу не п'еш, бо спіш, калі ўдасца заснуць, бо кішкі марш іграюць так, што і суседзі чуюць. І ні цукерачка, ні піўца... Адна пакута! Добра толькі, што гэтак мучыцца трэба толькі 14 дзён... А пасля вага трымаецца найменш гады два. Вернецца Агата, ой будзе рада, што муж ейны такі стройны зрабіўся! І паказацца файна ў людзях, і самому прыемна, калі нагавіцы не цесныя... А ў кампаніі весялей. Адна пакута, так сказаць, на пяцёх.

І, думаеце, не стрываў? Стрываў. Адно неяк не пісалася мне ні смешнага, ні страшнага. Бо для таго, каб мозг працаваў, трошкі трэба яму ежы. Скажам, глюкозы. А што сяду за ліст паперы, то яшчэ бялейшы мне ён робіцца. І як мне мае „смешнае" пісаць?! Праўда, ёсць моманты, што натхненне нахлыне, але рука не паспявае запісваць. На вагу не ўзлажу — буду важыцца пасля. Але штаны робяцца ўсё свабаднейшыя, значыць, эфект ёсць.

Напісаў я, намэнчыўшыся, фельетон, трохі, здаецца, смешнаваты. І паплёўся ў рэдакцыю „Нівы". Цяпер у рэдакцыю так проста не зойдзеш — спачатку трэба націснуць на кнопку аўтаадказчыка. Там нумара каля кнопачкі не паставілі, а хоць „Ніва" зразу направа, нумар мае... апошні. Ну, добра, націснуў я металёвы гузічак, штосьці там зафуркатала, і мне адчынілі дзверы ад вуліцы. А ў канцылярыі сядзіць нейкая паненка, падобная на Рамашку. Ды палова нашае дарагое Галінкі! А яна на мяне таксама вырачылася: не пазнае, ці што? Я лёгкім крокам шнурую да дзяўчат. А там за клавіятурай — палова Гені, цэлая шчупленькая пані Марыся, а вось Міра — якая была, дык гэткай і засталася, ёй ніякія дыеты не цікавыя. І Гандзя маланкава прамільгнула...

— Селі мы ўсе на шведскую дыету, — прашаптала Геня. — І сёння ўсе закончылі.

— Ну, дык вып'ем за поспех! — заглянуў з другога пакоя Міхась.

— А мне засталося яшчэ тры дні, — уздыхнуў я і весялей мне зрабілася.

Вандал Арлянскі

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Судзяць зладзейку з дзіцём на руках. Суддзя пытае яе:

— Замужняя?

— Удава, ад пяці гадоў.

— А гэтае немаўля на руках?..

— Высокі судзе! Гэта муж памёр, а не я.

* * *

Янка вяртаецца з жонкай з паховін цешчы. Раптам з даху падае каля ягоных ног чарапіца і разбіваецца.

— Бачыш, каханая, — кажа ён — мамачка ўжо ў небе.

* * *

На перапоўненым аргенцінскім футбольным стадыёне адно месца свабоднае...

— Гэта месца майго памерлага мужа, — тлумачыць жанчына ў жалобнай вопратцы. — Ён так хацеў паглядзець гэты матч...

— То можа вы дазволілі б сесці камусьці з ягоных сваякоў? — пытае адзін з гледачоў.

— Гэта немагчыма, бо ўсе яго сваякі на ягоных паховінах.

* * *

Удавец да прыёмшчыцы ў пахавальным прадпрыемстве:

— Адышла жонка. Будзьце ветлівы нарыхтаваць ёй паховіны...

— Што вы гаворыце?! Вы ж яе пахавалі год назад...

— Гэта была мая першая жонка. Ажаніўся паўторна...

— Што вы скажаце! А я і не ведала; віншую вас!

* * *

— Чаму ты не быў на паховінах свайго найлепшага сябра?

— Бо ён на маіх таксама не будзе.

* * *

— Дзе знаходзіцца пекла?

— Там, дзе кухарам англічанін, механікам араб, а каханкам амерыканец.

* * *

Чорт уручыў Брэжневу ларнет, каб той пабачыў пекла з воддалі. Брэжнеў убачыў буфет з самагонкаю і голых афіцыянтак. Калі пасля сам Брэжнеў апынуўся ў пекле, завыў ад роспачы:

— То якое ж я тады бачыў пекла?!

— Прапагандысцкае, — зарагатаў чорт.

* * *

— Якая розніца між польскім і амерыканскім пенсіянерам?

— Амерыканскі бярэ бутэльку брэндзі і ідзе на рыбалку. Польскі бярэ бутэльку з мачою і нясе яе ў лабараторыю.

Галоўную ўзнагароду...

... ў нашым конкурсе „У Еўропе аднолькавых шанцаў" — набор для вывучэння англійскай мовы (мультымедыйныя лекцыі + слоўнікі) — атрымоўвае **Барбара Якубюк** з Гайнаўкі.

ISSN 0546-1960